БЕЛАРУСЬ ПАМЯТАЕ: ПАРТЫЗАНЫ І ІХ ТРАФЕЙНЫ ГРУЗАВІК 4

МІНІСТР ЖКГ ПРА МЭТУ-99 І МНОГАЕ ІНШАЕ 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 СТУДЗЕНЯ 2021 г. СЕРАДА № 15 (29384)

ЛІЧБА ДНЯ

Br23 737,5 —

новы памер сямейнага капіталу з 1 студзеня 2021 года. З гэтага дня памер сямейнага капіталу падлягае штогадовай індэксацыі нарастаючым вынікам на велічыню індэкса спажывецкіх цэн за папярэдні год, разлічанага Нацыянальным статыстычным камітэтам. Індэкс спажывецкіх цэн за 2020 год у параўнанні з 2019 годам склаў 105,5 %. Адпаведна, памер сямейнага капіталу павялічваецца да Br23 737,5. У такім памеры сямейны капітал прызначаецца сем'ям пры нараджэнні (усынаўленні, удачарэнні) трэцяга або наступных дзяцей у перыяд з 1 студзеня да 31 снежня 2021 года. Сямейны капітал гарантуецца ў памеры, які дзейнічае на дату нараджэння, у выпадку ўсынаўлення (удачарэння) — на дату ўсынаўлення (удачарэння) трэцяга або наступных дзяцей. Пры з'яўленні ў сям'і трэцяга або наступных дзяцей у перыяд з 1 студзеня да 31 снежня 2020 года сямейны капітал прызначаўся ў памеры Br22,5 тысячы.

Родныя людзі

Тамара ЦУБЕР, Наталля КАВАЛЕНКА і Софія САМСОН — родныя сёстры, якія жывуць у адным і тым жа населеным пункце — Давыд-Гарадку Столінскага раёна. Яны сапраўдныя паляшучкі: моцна любяць свой край, мясцовую гаворку, зберагаюць народныя традыцыі, прыгожа спяваюць. Наогул, у іх сям'і было пяць сясцёр і два браты, і ўсе на дзіва вясёлыя і дружныя. Цяпер засталося шасцёра чалавек.Тамара, Наталля і Софія жывуць недалёка адна ад адной, часта бачацца, тым не менш пасядзець разам у цёплым доме, падзяліцца навінамі яны ніколі не адмаўляюцца. І чым больш сталыя па ўзросце становяцца, тым мацней шануюць адна адну.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- **Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінам.**
- З 1 лютага 2021 года павялічваюцца памеры дапамогі па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў у сувязі з ростам сярэднямесячнай заработнай платы.
- **Літаратурна-мастацкая выстаўка да 100-годдзя з дня нараджэння народных пісьменнікаў Беларусі Івана Мележа і Івана Шамякіна адкрыецца 28 студзеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

ISSN 1990 — 763X

На карысць

ЕЛКУ МОЖНА СЕКЧЫ, АЛЕ НЕЛЬГА СПАЛЬВАЦЬ У ПЕЧЫ

Чым небяспечныя хвойныя дрэвы і што з імі рабіць, асабліва пасля свят

Елкі, вывезеныя на смеццевыя палігоны, падчас гніення выдзяляюць у асяроддзе шкодныя рэчывы не горш за пластык. Такую ж шкоду хвойныя наносяць асяроддзю і падчас спальвання. Так што нашы бабулі, аказваецца, назапашваючы яловыя дровы, шкодзілі навакольлю, а ўжо пра звычку вэндзіць свежаніну, падпальваючы лапкі ядлоўцу, і казаць няма чаго. Ды хто ж пра тое тады ведаў... А вось што рабіць з елкамі ды соснамі цяпер, каб яны не атручвалі жыццё і не займалі месца на палігонах, расказалі і паказалі ў кампаніі па вывазе адходаў REMONDIS, якая абслугоўвае тры сталічныя раёны: Маскоўскі, Кастрычніцкі і Фрунзенскі.

БЫЛІ ПРЫГАЖУНЯМІ, СТАНУЦЬ... КАМПОСТАМ

Два гады назад у кампаніі вырашылі вывозіць елкі асобна ад астатняга смецця і рабіць з іх кампост на ўчастку па перапрацоўцы раслінных адходаў, што непадалёк ад Мінска. Летась тут ператварыліся ў карыснае ўгнаенне больш як 5000 елак, сёлета — звыш 10 тысяч дрэў. А ўсяго штогод пасля навагодніх свят толькі ў сталіцы застаецца 30—50 тысяч елак.

СТАР. 12

Спадчына

УНІКАЛЬНЫ МУЗЕЙ

Рэстаўрацыя Пятага форта стала завяршэннем трохгадовай праграмы Саюзнай дзяржавы ў Брэсцкай крэпасці

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

СТАР. 13

КАДРАВЫ ДЗЕНЬ У ПРЭЗІДЭНТА

Новыя Дзяржсакратар Саўбеза, кіраўнікі Брэсцкага аблвыканкама і КДК, гендырэктары СТБ і «Гродна Азот»

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прызначыў і ўзгадніў прызначэнне кіраўнікоў шэрагу дзяржаўных органаў і арганізацый краіны.

Фота БелТА.

«Мы павінны навучыцца супрацьстаяць і ўнутраным нашым праціўнікам, і асабліва — знешнім»

На вакантную пасаду Дзяржаўнага сакратара Савета Бяспекі прызначаны генерал-маёр Аляксандр Вальфовіч, які да ўчарашняга дня ўзначальваў Генеральны штаб Узброеных Сіл, быў першым намеснікам міністра абароны.

Менавіта з Віктарам Хрэніным і абмяркоўвалася кандыдатура Вальфовіча, расказаў кіраўнік дзяржавы і дадаў, што міністр пацвердзіў: больш падрыхтаванага чалавека сёння на пасаду кіраўніка Саўбеза ў Генштабе няма.

«Па-ваеннаму кажучы, вы чалавек абстраляны апошнімі падзеямі, ды і граматны чалавек. У Саўбезе — гэта, лічыце, галоўны памочнік Прэзідэнта па рабоце з сілавымі структурамі, — падзяліўся сваімі разважаннямі Вярхоўны Галоўнакамандуючы. — Вы сістэмны чалавек, бо не змаглі б працаваць начальнікам Генеральнага штаба, адукаваны і дасведчаны».

Прэзідэнт падкрэсліў, што менавіта сіламі Генштаба планаваліся мерапрыемствы на знешнім контуры краіны напярэдадні леташніх выбараў і пасля іх: «Досыць паспахова мы развярнулі тады нашы падраздзяленні, вайсковыя часці і адрэагавалі, калі спынілі магчымыя нядобразычлівыя нападкі на нашу краіну і спробы стварыць нам залішнія праблемы».

Час і цяпер няпросты, спробы расхістаць краіну не спыняцца, папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. «Мы гэта ведалі і разумелі разам з кіраўніцтвам Расіі яшчэ ў сярэдзіне мінулага года, — сказаў ён. — Для нас і для іх нечаканасцяў тут ніякіх няма. Але тым не менш, мы павінны навучыцца ў гэты цяжкі час супрацьстаяць і ўнутраным нашым праціўнікам, і асабліва — знешнім».

Перад Дзяржсакратаром Саўбеза пастаўлены шэраг новых задач, расказаў потым журналістам Аляксандр Вальфовіч і выказаў упэўненасць, што паспяхова з імі справіцца. «У краіне створана сістэма дзяржаўнай бяспекі, якая перш за ўсё, гарантуе бяспеку краіны, бяспеку народа, — сказаў ён. — Але тым не менш, ёсць што падкарэктаваць». Карэкціроўка будзе звязаная з сістэмай кіравання ўсім сілавым блокам, мяркуе Аляксандр Вальфовіч, каб мінімізаваць знешнія і ўнутраныя пагрозы. Яна закране і нарматыўную прававую базу.

Новыя задачы і класіка КДК

Васіль Герасімаў, які выконваў абавязкі старшыні КДК і з'яўляўся першым намеснікам кіраўніка гэтага ведамства, узначаліць Камітэт дзяржаўнага кантролю.

Пра работу Камітэта дзяржаўнага кантролю Прэзідэнт сказаў: «Мне аператыўнасць апошнім часам падабаецца. Малайцы. І далей трэба дзейнічаць жорстка, адстойваючы інтарэсы беларускай дзяржавы. Паводле закона. У нас хапае — уся заканадаўчая база створана, каб спыняць усякія спробы дэстабілізацыі абстаноўкі ў нашай краіне».

Сфера кантролю КДК перш за ўсё — замежнае фінансаванне дэструктыўнай дзейнасці ў Беларусі, акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. «І дзейнасць камерцыйных, так званых, структур і прадпрыемстваў, асобных дзялкоў, — дадаў ён, заўважыўшы, што «Камітэт дзяржкантролю навучыўся ў гэтым кірунку працаваць».

Застаюцца і традыцыйныя задачы КДК — кантроль за папаўненнем дзяржаўнага бюджэту і выкарыстаннем дзяржаўнай уласнасці.

«Вазьміце, калі ласка, на кантроль заканчэнне будаўніцтва недабудаваных аб'ектаў, — распарадзіўся Аляксандр Лукашэнка. — У нас вельмі шмат даўгабудаў. Вядома, значна менш, чым гэта было пяць гадоў таму, але яны ёсць».

Даручэнне адносна бюджэту — пазбавіцца ад фінансавых мерапрыемстваў, без якіх можна абысціся.

Колькасць праверак змяншаецца, і не толькі з боку КДК, расказаў журналістам Васіль Герасімаў пасля сустрэчы з Прэзідэнтам.

Апроч незаконнага фінансавання дэструктыўнай дзейнасці з-за мяжы, выканання бюджэту, эфектыўнага выкарыстання дзяржаўнай уласнасці, у сферы ўвагі Камітэта дзяржкантролю застаецца пасрэдніцкая дзейнасць і падаткаабкладанне.

«Некалькі разоў, напрыклад, абмяркоўвалася пытанне адносна індывідуальных прадпрымальнікаў, якія па сутнасці ператварыліся ў юрасоб, толькі з мінімальнымі падаткамі, а не займаюцца тымі кірункамі, што абазначаліся раней, — сказаў новапрызначаны кіраўнік ведамства. — Плюс усе астатнія даручэнні Прэзідэнта, якія ёсць, а вы ведаеце, што Камітэт якраз кантралюе выкананне даручэнняў Прэзідэнта».

Людзі і развіццё рэгіёна

Юрый Шулейка (да ўчарашняга дня — памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гомельскай вобласці) прызначаны кіраўніком Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што абмяркоўваў гэтае прызначэнне з самім кандыдатам яшчэ месяц таму. Новы кіраўнік Брэстчыны будзе прадстаўлены калектыву аблвыканкама ў наступны панядзелак.

«Пасля Гродзенскай вобласці (у мяне ў плане Гродзенская вобласць) я прыеду да вас, — папярэдзіў ён новага губернатара і выказаў меркаванне, што шмат часу для ўваходжання ў курс новай справы таму не спатрэбіцца. — Вы працуеце на пасадзе ў канкрэтным рэгіёне, ведаеце кірунак работы, вопыт у вас вялікі. І вы ўжо канкрэтна праінфармуеце пра болевыя кропкі Брэстчыны і асабліва Брэста, з улікам апошніх падзей канца мінулага года, поствыбарнага перыяду, каб мы маглі сарыентавацца па далейшай рабоце».

Юрый Шулейка шмат часу працаваў на роднай Гродзеншчыне, у тым ліку на кіраўнічых пасадах. Характарызуючы вобласць, якую ён узначаліў, губернатар адзначыў: «Моцны сельскагаспадарчы рэгіён, наймагутнейшая перапрацоўка краіны, транспартная артэрыя, як чыгуначная, так і аўтамабільная, вялікі кавалак дзяржаўнай граніцы — з Захадам, з суседняй Украінай. Гэта добрыя людзі, якія працуюць там. Заўсёды брастаўчане славіліся сваёй працавітасцю». — Ён дадаў, што сярод асноўных задач кіраўніка дзяржавы — людзі і далейшае развіццё рэгіёна.

«Вельмі важнае прадпрыемства, стратэгічнае»

Кандыдатура Ігара Ляшэнкі, які апошнім часам узначальваў прадстаўніцтва ААТ «Гомельтранснафта Дружба» ў Мінску, узгодненая на пасаду генеральнага дырэктара ААТ «Гродна Азот».

«Гэта ваша прадпрыемства, калі вы працавалі і на пасадзе міністра, і віцэпрэм'ера. Вельмі важнае прадпрыемства, стратэгічнае, — сказаў новаму кіраўніку «Гродна Азота» Прэзідэнт. — Мы шмат казалі пра тое, што ніякіх хістанняў на гэтым прадпрыемстве быць не можа, бо не дай бог, што здарыцца, зараза накрые ўвесь горад Гродна. Таму там павінна быць жорсткая дысцыпліна. Не толькі тэхналагічная, але і ў арганізацыйным плане».

Ігар Ляшэнка ў размове з журналістамі заўважыў, што новы азотны комплекс на «Гродна Азот», прыкладны кошт якога 1,3 мільярда долараў, стратэгічна важны не толькі для канцэрна «Белнафтахім», але і для ўсёй краіны, у прыватнасці, для сельгасспажыўцоў, ён таксама будзе садзейнічаць росту экспарту.

«Другая задача, якую трэба рэалізаваць, — глыбокая мадэрнізацыя магутнасцяў, якія ўжо там маюцца, з іх прыростам, — дадаў ён. — Прычым мадэрнізацыя павінна прайсці без спынення асноўнай вытворчасці».

«Канал вельмі падцягнуўся»

Вакансію генеральнага дырэктара ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» зойме Кірыл Казакоў, які дагэтуль быў намеснікам генеральнага дырэктара дадзенай кампаніі.

«Так атрымалася, што я асабіста ўбачыў вас у справе, — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка. — Канал вельмі падцягнуўся». Кіраўнік дзяржавы пахваліў СТБ за тое, што там з'явілася шмат новых твараў, у тым ліку маладых і патрыятычна настроеных, новыя праграмы.

Кірыл Казакоў падзякаваў сваёй камандзе за работу ў апошнія паўгода і заўважыў, што задачы, якія перад ім паставіў Прэзідэнт, не новыя.

«Мы павінны асвятляць сумленна тое, што адбываецца зараз у Беларусі. Мы зрабілі акцэнт на аўтарскую журналістыку, гэта было ацэнена, і думаю, што менавіта ў такім кірунку тэлеканал СТБ будзе рухацца далей», — пракаментаваў ён прадстаўнікам СМІ сваё прызначэнне.

У Клімавічах — новы старшыня райвыканкама

На пасаду старшыні Клімавіцкага райвыканкама ўзгоднена кандыдатура Міхаіла Дзямідава з Бялыніч (працаваў там першым намеснікам старшыні, начальнікам упраўлення па сельскай гаспадарцы і харчаванні райвыканкама).

«Што датычыцца вашага раёна, адкуль вы сыходзіце, — добры раён», — звярнуўся да яго Прэзідэнт і выказаў спадзяванне, што вопыт, набыты на ранейшым месцы работы, новы кіраўнік перанясе на Клімавіцкі раён. У гэтым Міхаілу Дзямідаву будзе аказана падтрымка, запэўніў Аляксандр Лукашэнка і таксама анансаваў свой візіт у Клімавіцкі раён сёлета.

У рабочым парадку Прэзідэнт узгадніў прызначэнне членам Віцебскага аблвыканкама кандыдатуру начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў гэтага рэгіёна Андрэя Любімава.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Ва ўрадзе

СІНЕРГЕТЫЧНЫ ЭФЕКТ ДЛЯ САЮЗНАЙ ЭКАНОМІКІ

Прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі Раман ГАЛОЎЧАНКА і Міхаіл МІШУСЦІН правялі перагаворы ў Маскве

Сустрэчы прайшлі ў вузкім і пашыраным фармаце. У складзе беларускай урадавай дэлегацыі таксама першы намеснік прэм'ер-міністра Мікалай Снапкоў, міністр энергетыкі Віктар Каранкевіч, міністр фінансаў Юрый Селіверстаў, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір Калтовіч, старшыня канцэрна «Белнафтахім» Андрэй Рыбакоў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі Уладзімір Сямашка.

У сваёй прамове на перагаворах Раман Галоўчанка назваў Расію найбліжэйшым саюзнікам нашай краіны, таму парадак дня першай урадавай сустрэчы ў новым годзе быў не толькі вялікі, але і пазітыўны. Ён адзначыў, што кантакты на ўзроўні ўрадаў носяць рэгулярны характар. Нягледзячы на складанасці, павялічваецца гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Па словах прэм'ер-міністра, за мінулы год доля Расіі ў знешнім гандлі Беларусі таварамі і паслугамі прыблізілася да 50 %.

«У нас не адбылося крытычнага зніжэння ўзаемнага гандлю, нягледзячы на складанасці з ковідам. Але мы страцілі каля 20 працэнтаў агульнага аб'ёму (гандлю. — **«Зв.»**). У гэтым годзе, мяркую, ёсць усе прадпасылкі, каб гэты спад пераадолець. Сітуацыя абсалютна кіраваная», — сказаў Раман Галоўчанка.

Рэзервы для росту ёсць у прамысловасці, будаўніцтве, сельскай гаспадарцы. Прамыя кантакты і работа, накіраваная на вынік, у сённяшніх умовах, адзначыў прэм'ер, — прыярытэтная задача для ўрадаў і гаспадарчых суб'ектаў краін.

Знакавымі прыкладамі сумеснай плённай работы ўрадаў летась Раман Галоўчанка назваў пуск БелАЭС, захаванне ключавых параметраў тавараабароту, сістэмныя дамоўленасці па ўдзеле прамысловай прадукцыі ў дзяржаўных, муніцыпальных закупках, у асноўным вырашэнне пытанняў допуску беларускай сельгаспрадукцыі на расійскі рынак, узаемадзеянне па ўвядзенні маркіроўкі і прасочванні тавараў, праект па транзіце тавараў з прымяненнем электронных пломбаў, узаемнае прызнанне віз.

«Ёсць шэраг актуальных задач, якія маюць быць выкананыя ў гэтым годзе. Сярод іх — пошук сістэмных рашэнняў па агульным энергетычным рынку Саюзнай дзяржавы і ЕАЭС, рэгуляванне сістэмных пытанняў доступу прадуктаў на агульны рынак. На наш погляд, мы даўно ўжо павінны былі падысці да найважнейшага паняцця «тавар», «прадукцыя ці паслугі» Саюзнай дзяржавы», — вызначыў пункты далейшага ўзаемадзеяння Раман Галоўчанка.

Прэм'ер-міністр заявіў, што суразмоўцам неабходна разбірацца ў сутнасці пытанняў, значна не засяроджваючыся на форме, намацваць сферы, дзе эканамічныя інтарэсы дзвюх краін спалучаюцца, а іх аб'яднанне будзе мець пазітыўны сінергетычны эфект.

Па выніках перагавораў стала вядома, што краіны мяркуюць падпісаць пагадненне аб перавалцы беларускіх грузаў праз расійскія парты. Таксама Раман Галоўчанка заявіў, што прынятыя ў краінах меры супраць коўіду дазваляюць спадзявацца на аднаўленне пасажырапатоку.

Марыя ДАДАЛКА.

«За Беларусь!»

Сэлфі з прэс-сакратаром і за прэзідэнцкай трыбунай

Палац Незалежнасці працягвае прымаць гасцей

На чарговую экскурсію па рэзідэнцыі Прэзідэнта запрасілі ўдзельнікаў аўтапрабегу «За адзіную Беларусь!» і іншых патрыятычных мерапрыемстваў. Гасцей з усіх рэгіёнаў краіны вітала прэс-сакратар кіраўніка краіны Наталля ЭЙСМАНТ.

«Мы перадавалі ўражанні мінулых экскурсійных груп кіраўніку краіны. Ён паабяцаў: пакуль апошні патрыёт, удзельнік патрыятычных акцый, які хоча сюды прыйсці, не наведае Палац Незалежнасці, мы будзем іх прымаць», — сказала прэс-сакратар.

У народзе комплекс называюць рабочай рэзідэнцыяй кіраўніка краіны. Але, як дадала Наталля Эйсмант, Прэзідэнт не вельмі любіць такое азначэнне. Некалькі гадоў таму ён загадаў праводзіць для ахвотных экскурсіі па комплексе, тым самым падкрэсліваючы, што палац належыць у першую чаргу народу. Дарэчы, велічныя прасторы, адмыслова аформленыя залы паказваюць беларусам, якую прыгажосць могуць стварыць іх жа суайчыннікі. Абсалютна ўсё, па словах экскурсавода Александрыны, зроблена ў Палацы Незалежнасці рукамі айчынных майстроў і амаль усё (акрамя мармуровых і гранітных падлог) з матэрыялаў, здабытых у Беларусі.

Падчас падарожжа госці рабілі фотаздымкі. Нікому не адказвала ў размове і магчымасці зрабіць сэлфі прэс-сакратар Прэзідэнта. Усяго ў мінулы панядзелак у Палацы Незалежнасці было дзве экскурсіі, у якіх узяло ўдзел каля 100 чалавек. Многія з гасцей прыходзілі на мерапрыемства сем'ямі, таму ў велічных залах гучаў дзіцячы смех і чуліся здзіўленыя воклічы.

Наведвальнік палаца Віталій Леановіч адзначыў у размове з карэспандэнтамі маштаб збудавання: «Наша дзяржава, Беларусь вельмі прыгожая. А гэты Палац — аблічча, сімвал, цэнтр нашай краіны. Прыгажосць неймаверная. Вось такімі і мы, беларусы, павінны быць, як гэта збудаванне, — годнымі, маналітнымі, моцнымі, прыгожымі і ўпэўненымі ў сабе».

Падзяліўся ўражаннямі і работнік прадпрыемства «Магілёўхімвалакно» Аляксандр Шкадаў. «Грандыёзна! Самае галоўнае, што гэта зроблена нашымі будаўнікамі. Гэта сімвал незалежнасці краіны», — звярнуў увагу ён.

Вольга Сушко разглядала палац разам са сваімі сынамі 12 і 6 гадоў. Разам з імі яна ўдзельнічае ў аўтапрабегах і прызнаецца, што сваёй грамадзянскай пазіцыі не хавае. «Мы звычайная сям'я з прыгарада. І мы за Беларусь, за нашага Бацьку! Марым, каб у нас усё было добра і быў мір», — расказвае жанчына.

Экскурсіі для ўдзельнікаў патрыятычных акцый будуць працягвацца. Некаторыя адбудуцца ўжо на гэтым тыдні.

Марыя ДАДАЛКА.

Правілам жыцця навучаць цікава

Адукацыйны цэнтр бяспекі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях адкрыўся ў Мінску

Новы трохпавярховы будынак знаходзіцца на вуліцы Алешава. На агульнай плошчы амаль у 11 тысяч квадратных метраў размясціліся больш за 30 інтэрактыўных пляцовак. Экспазіцыі прысвечаны крымінальнай, прамысловай, экалагічнай, атамнай, радыяцыйнай і пажарнай бяспецы, правільным паводзінам у надзвычайных сітуацыях, на транспартных аб'ектах, падчас неспрыяльных метэаралагічных умоў, а таксама вядзенню здаровага спосабу жыцця.

Фота БелТА.

Цэнтр бяспекі адкрылі **старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ і міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.**

— Такія адукацыйныя цэнтры па бяспецы нашых грамадзян адкрыты ва ўсіх абласцях краіны па даручэнні Прэзідэнта, — адзначыла Наталля Качанава. — Гэта выдатная ўстанова, дзе будуць вучыцца як дзеці, пачынаючы з дашкольнага ўзросту, так і дарослыя. Бяспека для нас вельмі важная. Штодня чалавек можа сустрэць разнастайныя надзвычайныя або крытычныя сітуацыі, таму трэба ведаць і ўмець як мага больш. Пабудаваны ладны будынак, у якім лёгка і пазнавальна раскажуць усю неабходную інфармацыю. Ён стане цудоўным падарункам як для жыхароў Мінска, так і для гасцей сталіцы.

Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка адзначыў, што бяспека — адзін з найважнейшых крытэрыяў развіцця любой дзяржавы і грамадства.

— А ўнёсак у бяспеку дзяцей — гэта ўклад у нашу будучыню, — адзначыў міністр. — Таму мы робім акцэнт менавіта на такую катэгорыю наведвальнікаў. І спыняцца на гэтым не збіраемся. Цэнтр бяспекі пабудаваны ў межах Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады. Аналагічныя цэнтры ў рэгіёнах карыстаюцца велізарнай папулярнасцю, многія дзеці просяць схадзіць туды неаднойчы. Веды, атрыманыя тут, дапамогуць ім на працягу ўсяго жыцця.

Кіраўнік ведамства выказаў пажаданне, каб такія ўстановы з'явіліся па магчымасці ў кожным раёне краіны.

— Методыка навучання ў цэнтры пабудавана па прынцыпе забаўляльнай гульні, — адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Навучальныя праграмы грунтуюцца на стварэнні асяроддзя, максімальна набліжанага да рэальнай надзвычайнай сітуацыі. Стварыць яго дапамагаюць адмысловыя трэнажоры і сімулятары. Тут выкарыстоўваюцца сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. Гэта віртуальная і дапоўненая рэальнасць, інтэрнэт рэчаў, камп'ютарны зрок.

Напрыклад, на адным з паверхаў цалкам змадэлявана старая гарадская забудова — двухпавярховыя домікі паабапал вузкай вуліцы. У сваю чаргу, гэтая вуліца вядзе ў сучасны мегаполіс з шырокімі праспектамі. На іх мадэлююцца разнастайныя дарожныя сітуацыі, у якія можа трапіць пешаход. Наступная зала імітуе чыгуначную станцыю, на якой устаноўлены макет электрацягніка і зроблены пераход праз пуці. З іншага боку саставу размешчаны нават самалётны трап.

Пасля чыгуначнай станцыі мы прыходзім у спецыяльны пакой, дзе імітуецца землятрус сілай да дзевяці балаў па шкале Рыхтэра. Хоць для нашай краіны штуршкі зямлі — нешта з разраду экзотыкі, але хто ведае, у якой краіне чалавека можа заспець неспадзяванка? А ведаць, што рабіць падчас землятрусу, не перашкодзіць.

Пераходзім у задымлены лабірынт. Менавіта ў такіх умовах на пажарах працуюць ратавальнікі — пры амаль нулявой бачнасці, звілістых калідорах і парогах, аб якія можна спатыкнуцца падчас праходу ў памяшканне, дзе адбываецца бяда... Таксама на гэтым паверсе раскажуць аб тым, як правільна сябе паводзіць у лесе.

Трэці паверх пачынаецца з мадэлявання сітуацыі крымінальнай небяспекі. Напрыклад, што рабіць, калі вы ідзяце дадому, а на лесвіцы сядзіць кампанія маргінальных асоб? Альбо як захаваць ад крадзяжу свой веласіпед? А як сябе паводзіць, калі ў ліфт з вамі хоча ўвайсці незнаёмы чалавек? Пра гэта раскажуць прадстаўнікі Міністэрства ўнутраных спраў.

Мяркуецца, што ў перспектыве ў цэнтры з'явіцца тэматычная пляцоўка, прысвечаная шкодзе ад наркотыкаў. Яна будзе падрыхтавана сумесна з Міністэрствам унутраных спраў. Яшчэ адна пляцоўка, прысвечаная тэме атамнай і радыяцыйнай бяспекі, рэалізуецца ў супрацоўніцтве з Мінэнерга.

— Перад тым як пабудаваць і аснасціць адукацыйны цэнтр бяспекі, мы ўлічылі досвед, які назапасіўся за пяць з лішнім гадоў работы гэтых структур у Беларусі, — адзначыў Віталь Навіцкі. — Яны месцяцца ў Гомелі, Віцебску, Барані, Лідзе, Століне, Магілёве, Барысаве і Наваполацку. За гэты час у іх прайшло навучанне больш за 226 тысяч чалавек. З іх каля 190 тысяч — дзеці.

І плён ад дзейнасці такіх цэнтраў бяспекі відавочны. Калі параўноўваць з 2015 годам, колькасць дарослых людзей, якія загінулі падчас надзвычайных сітуацый, скарацілася ў 1,2 раза, а дзяцей — увогуле ў шэсць.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Вектар развіцця Прыдзвіння

У ЧОРА адбыўся абласны сход удзельнікаў VI Усебеларускага народнага сходу ад Віцебскай вобласці. Рэгіён прадставяць 310 дэлегатаў.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА падкрэсліў, што адна з задач будучай падзеі — аб'яднаць наша грамадства і даць адказы на самыя актуальныя для людзей пытанні. Ён распавёў пра тое, што сёння свет становіцца больш жорсткі. У міжнародных адносінах замест дыялогу прыходзіць палітыка дыктату і санкцый. Пад пытанне ставіцца гістарычная праўда і права народа самому вызначаць свой лёс... І ў гэтых няпростых умовах трэба ўсё магчымае зрабіць для таго, каб захаваць беларускую дзяржаўнасць, забяспечыць грамадзянскую згоду, вызначыць стратэгічныя перспектывы развіцця краіны, падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. Павышэнне якасці жыцця і пашырэнне ўдзелу грамадзян у прыняцці дзяржаўных рашэнняў — гэтыя рэаліі трэба ўлічваць пры магчымым прыняцці рэформаў. Разам з тым галоўнае, каб улічваліся запыты грамадства, не адарваныя ад жыцця. І традыцыйная рыса беларускай дзяржаўнасці — сацыяльная справядлівасць — павінна паранейшаму быць галоўным фактарам пры распрацоўцы праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця і прапаноў па ўдасканаленні грамадска-палітычнага жыцця нашай краіны.

Спікер парламента заклікаў да шчырай размовы, ацэнкі планаў, якія прапаноўваюцца ўрадам, з пункту гледжання жыхароў канкрэтных рэгіёнаў і з улікам мясцовых праблем.

У Палаце прадстаўнікоў абагульнілі каля 5,5 тысячы прапаноў, у тым ліку наконт канстытуцыйнай рэформы.

Міністр эканомікі Аляксандр ЧАРВЯКОЎ падзяліўся вынікамі мінулай пяцігодкі і агучыў праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2021—2025 гады.

Міністр эканомікі падкрэсліў, што сярод прыярытэтаў эканомікі, як і раней, будзе сацыяльная накіраванасць. Асноўную ўвагу ўдзеляць павышэнню даходаў насельніцтва, забеспячэнню занятасці, развіццю высокатэхналагічных паслуг у медыцыне і адукацыі. Трэба будзе нарошчваць індустрыяльны патэнцыял у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, але на новай тэхналагічнай базе і лічбавай аснове. Стаўка — на стварэнне прадпрыемстваў новага тэхналагічнага пакалення.

Рост даходаў павялічыць унутраны попыт. Інвестыцыі будуць прыцягваць больш актыўна — гэта гарантыя развіцця вытворчасці. Будзе створана экспартна-імпартнае агенцтва, каб дапамагчы рэалізоўваць нашу прадукцыю і паслугі за мяжой. Мяркуецца арганізаваць 13 кластараў у найбольш перспектыўных сферах. І тры з іх — на Віцебшчыне (нафтахімічны і фармацэўтычны тут ужо дзейнічаюць). Яшчэ з'явіцца льняны.

Наконт вектару развіцця Віцебшчыны, Аляксандр Чарвякоў адзначыў, што ў Мёрах пабудуюць завод па вытворчасці электродаў, у Наваполацку — сістэм кіравання для электрычнага транспарту, у Віцебску будуць вырабляць альтэрнатыву антыбіётыкам.

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСНЁЎ падвёў вынікі дзейнасці Прыдзвіння і распавёў пра планы на 2021—2025 гады. У вобласці зроблена многае, каб захаваць стабільную сацыяльна-эканамічную абстаноўку ў вельмі няпростых умовах: ад валютных крызісаў да ўплыву пандэміі на ўсе галіны эканомікі. За пяцігодку рэальная зарплата павялічылася ў 1,3 раза. На новыя рабочыя месцы ўладкавалі за пяць гадоў больш за 30,5 тысячы чалавек. Не дапусцілі росту беспрацоўя. Сярэдняя працягласць жыцця 73,5 года і за дзве пяцігодкі павялічылася на чатыры гады. Прадукцыя сельскай гаспадаркі становіцца ўсё больш рэнтабельнай. У глыбінцы робіцца многае, каб людзі не пакідалі родныя мясціны, каб быў конкурс сярод маладых спецыялістаў, каб можна было ўладкавацца на ферму ці іншае сельскагаспадарчае прадпрыемства, якія адпавядаюць усім патрабаванням часу. Усё больш прыкметных станоўчых змен у медыцыне, адукацыі, культуры, спартыўнай галіне.

Міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй ХМЕЛЬ распавёў пра ведамасныя планы, накіраваныя на тое, каб усім карыстальнікам ЖКГ былі па кішэні паслугі і пры гэтым іх якасць паляпшалася. Прастора вакол людзей павінна адпавядаць вядучым трэндам. Добраўпарадкаванне актывізуецца дзякуючы зваротам людзей, вывучэнню іх меркаванняў і прапаноў.

Міністр працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Ірына КАСЦЕВІЧ падкрэсліла, што галоўная каштоўнасць краіны — чалавек. І ў цэнтры ўвагі ўсё, што датычыцца якасці і ўзроўню жыцця грамадзян. Сям'я і дзеці, дастойныя работа і заробкі — усё гэта ўлічваюць пры распрацоўцы праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця. Многае ўжо зроблена і яшчэ трэба зрабіць, каб стварыць умовы для паляпшэння дэмаграфічнай сітуацыі, клопату пра састарэлых, людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Дэлегаты актыўна задавалі пытанні, у тым ліку наконт магчымасці ўвядзення дадатковых прэферэнцый для прадпрымальнікаў у глыбінцы, тэндараў у сістэме ЖКГ, замацавання кадраў на вёсцы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

75 мірных гадоў Беларусь ПАМЯТАЕ!

ДАПАМОГА ПРЫЙШЛА НЕЧАКАНА

Як вайскоўцы на захопленым нямецкім аўтамабілі прарываліся да партызанаў і выратавалі людзей ад расстрэлу

Наш даўні сябар — жыхар Вялікай Бераставіцы — Міхаіл Маскальчук даслаў нам чарговы цікавы аповед, які быў запісаны са слоў бацькі Міхаіла, Васіля Маскальчука. З яго мы даведаліся, як два вайскоўцы Чырвонай Арміі, якія выходзілі з акружэння, выратавалі ад расстрэлу мірных жыхароў і двух камандзіраў, а пасля трапілі ў партызанскі атрад.

— Усе партызаны ў нашым баявым 132-м атрадзе 130-й брыгады Палескага злучэння ў нядаўнім мінулым у асноўным былі байцамі і камандзірамі Чырвонай Арміі, якія выйшлі з акружэння пасля цяжкіх баёў або збеглі з палону. Яны разумелі, што да сваіх часцей, якія ў гэты час ваююць далёка на ўсходзе, яны прарвацца не здолеюць. Адзінае, што заставалася, — біцца з ворагам тут, у бяскрайніх беларускіх лясах.

Атрад быў створаны ў верасні 1941 года. Ля вытокаў яго арганізацыі стаялі палітрук танкавых войскаў Аляксей Тарасаў, камандзір узвода лейтэнант Рыгор Кравец, камандзір кулямётнага ўзвода сяржант Сумбат Арзуманян. Да лістапада 1941 года ў атрадзе было больш за пяцьдзясят добра ўзброеных байцоў. У нас было шмат савецкай і трафейнай зброі — аўтаматы, кулямёты, вінтоўкі...

Я са сваімі сябрамі Мікалаем Чартковым, Канстанцінам Міхаленем і Аляксандрам Гаўрыловічам уступілі ў гэты атрад улетку 1942 года. Нас прымалі ў вёсцы Грабаў Петрыкаўскага раёна тагачаснай Палескай вобласці. Хваляваліся: а раптам не возьмуць? Калі хто прыходзіў без зброі, таго ж адразу адпраўлялі дадому. Нам пашанцавала — у нас былі гранаты РГД-33, дзве вінтоўкі Мосіна і нават нямецкі кулямёт. Таму прынялі, нягледзячы на маладосць.

— Сцяпан, адвядзі хлопцаў на кухню, няхай іх там добра накормяць, — звярнуўся да вартавога Рыгор Кравец.

Кухня часова знаходзілася ў прасторнай вясковай хаце. З коміна весела курыўся дымок, а з боку хаты даносіўся пах баршчу. Калі ж мы зайшлі ў хату, то аслупянелі. Каля печы завіхаліся дзве прыгожыя дзяўчыны нашага ўзросту і адна крыху старэйшая. Усе яны былі апрануты ў ваенную форму.

Калі ж мы пачалі есці, то пачулі, што да дома пад'язджае машына. Я зірнуў у акно і здранцвеў: тарахцеў нямецкі грузавік.

— Не хвалюйцеся, — прамовіла адна з дзяўчат. — Гэта наш трафейны грузавік прывёз прадукты.

У хату, прыгнуўшыся ў праёме дзвярэй, увайшоў велізарны баец са знакамі адрознення старшыны.

— Бася, прымай прадукты, — звярнуўся ён да старшай паварыхі. І дадаў, абняўшы дзяўчат. — Ну, як вы, не крыўдзяць вас тут? Калі што, кажыце, я хутка разбяруся!

Мы паелі, дапамаглі разгрузіць машыну. Затым Сцяпан павёў нас знаёміцца з байцамі нашага ўзвода. Па дарозе мы папрасілі яго расказаць пра дзяўчат са сталовай, старшыну і тое, як трапіла ў атрад нямецкая машына.

— Гэта дзіўная гісторыя, у яе цяжка паверыць, але факты ёсць і ад іх нікуды не дзенешся, — вымавіў Сцяпан і, прысеўшы на павалены ствол сасны, пачаў расказваць.

...Фёдар перад вайной служыў на Далёкім Усходзе, на самай мяжы з Маньчжурыяй, якую тады захапілі японцы. Дзякуючы гэтаму ён навучыўся японскім адзінаборствам, рукапашнаму бою. Да таго ж умеў вадзіць розныя аўтамабілі.

Пачатак вайны Фёдар сустрэў у Беларусі. Яго часць вяла цяжкія баі ў раёне Слуцка, Старых Дарог, Глуска. Двойчы траплялі ў акружэнне. Ратаваліся толькі дзякуючым бяскрайнім беларускім лясам.

Часць мела загад — асобнымі групамі прарывацца на ўсход, але выканаць яго было нерэальна. Неўзабаве з Фёдарам застаўся толькі лейтэнант-перакладчык Іван з разведкі стралковага палка.

...Фёдар з Іванам стаіліся ў густым хмызняку. Па шашы непадалёк бесперапынна ішлі на ўсход нямецкія аўтамабілі. Дарога ўзмоцнена ахоўвалася.

— Пераходзіць дарогу будзем на досвітку, калі паток машын прыкметна зніжаецца. І рушым у напрамку Мазыра, на поўдзень, — сказаў Фёдар. Ён меркаваў, што недзе там ішла лінія фронту. Але надзеі былі марныя. Уначы паток транспарту не слабеў.

А чацвёртай раніцы рух на дарозе крыху спаў. На ўзбочыне, якраз насупраць сяброў, спыніўся грузавік, крыты тэнтам. З кабіны вылез нямецкі обер-лейтэнант. Расшпільваючы на хаду рэмень штаноў, ён накіраваўся да хмызняку. Велізарны шафёр у форме яфрэйтара адкрыў капот і пачаў корпацца ў маторным адсеку.

— Іван, лепш не рухайся, — прашаптаў Фёдар. — Зараз займуся афіцэрам.

Велізарныя ногі ў брудных абмотках было апошнім, што ўбачыў немец. Тут жа Фёдар рабром далоні з усяе сілы ўдарыў па шыі немца. Той як нежывы зваліўся на мох.

— Іван, у тэмпе сюды, — прашаптаў Фёдар. — Распранай немца і апранай форму на сябе, а я займуся шафёрам.

Фёдар зірнуў з-за куста, на трасе было пуста. Падкраўшыся з тылу да машыны, Фёдар сцягнуў фашыста з буфера і, заціснуўшы рот далонню, пацягнуў яго ў кусты, дзе і закалоў.

Праз пару хвілін з лесу выходзілі обер-лейтэнант з парабелумам у чорнай кабуры і велізарны яфрэйтар са штык-нажом на поясе.

— Хутчэй едзем адсюль, пакуль ахова не знайшла трупы! — вымавіў Фёдар, сядаючы за руль грузавіка. Але праз пару кіламетраў машыну спыніў.

— Іван, тэрмінова правер дакументы. Трэба даведацца, якая місія ў гэтага обер-лейтэнанта. А я пагляджу свае, — вымавіў Фёдар, дастаючы з кішэні паперы.

— Гэты обер — снабжэнец з тылу. Тут у дакуменце штамп — аказваць гэтай асобе ўсялякае садзейнічанне, — прамовіў Іван, хаваючы дакументы.

— А я проста твой шафёр Курт Мілер. У выпадку чаго будзеш казаць, што я нямы. Дакладней, кантужаны рускай бомбай. Я ж па-нямецку ні бэ ні мя, толькі літары ведаю, — адказаў Фёдар, кранаючыся з месца.

Як толькі ўзнялося сонца, рух на дарозе аднавіўся ў абодва бакі. На машыну Фёдара ніхто не звяртаў увагі. Калі пад'ехала палявая кухня, калона спынілася. Фёдар, скарыстаўшыся момантам, залез у кузаў. Там аказаліся скрыні са зброяй, кансервы, шакалад...

Да машыны падышоў нямецкі афіцэр у чыне обер-лейтэнанта.

Іван прывітаў лейтэнанта, спытаў, ці хутка паедзем. — Бальшавікі зладзілі засаду на дарозе, спалілі некалькі нашых машын, але мы выклікалі самалёты. Хутка іх разгоняць, і мы рушым далей. У Глуску папоўнім запасы і рушым далей на ўсход, — сказаў афіцэр.

Напарадзе прыбралі завалы, якія ўтварылі спаленыя машыны, і калона рушыла далей. У Глуску, акрамя харчоў, узялі тры бочкі бензіну. У бардачку аўтамабіля ляжаў дакумент, колькі і чаго трэба атрымаць і ў якія часці даставіць. Але паўсюль была мітусня, усё пераблыталася, ніхто нікога не правяраў, таму што на месцы патрэбных часцей не было. Яны ці то адставалі, ці то пайшлі наперад. На іх месцы аказваліся зусім іншыя, а СД і гестапа было мала, каб усіх дасканальна правяраць. Так мінула два дні.

— Што будзем рабіць, Іван? — спытаў Фёдар. — Я думаю, нам трэба вяртацца ў палескія лясы. Будзем партызаніць, фронт нам ужо не дагнаць, немцы паўсюль, пруць на Маскву.

— Ты маеш рацыю, зараз зручны момант, машыны ідуць у двух напрамках. Ніхто на нас не зверне ўвагі, — адказаў Іван. — Калі зменшыцца паток машын, разварочваемся і кіруемся ў любанскія лясы. Там засталося шмат байцоў з нашых часцей і палкоў.

Выбраўшы момант, Фёдар развярнуўся на бліжэйшым скрыжаванні і паехаў у зваротным напрамку. Па ўзбочынах нямецкія канваіры вялі сотні нашых палонных.

Заехалі ў Старыя Дарогі, там атрымалі яшчэ харчоў, патроны для аўтаматаў і вінтоўкі, заправілі напоўніцу бакі аўтамабіля.

Выехаўшы з горада, узялі напрамак на Любань. Раптам на дарозе ўбачылі чатырох фашыстаў з аўчаркамі і аднаго хлопца ў цывільнай вопратцы. Яны вялі шэсць дзяўчат і двух вайскоўцаў.

— Вядуць, гады, на расстрэл, — прагаварыў Фёдар. — Падрыхтуй сабе аўтамат да бою.

Абагнаўшы групу людзей, ён рэзка спыніўся. Іван, узвёўшы затвор аўтамата, выйшаў з кабіны.

— Вашы дакументы, — крыкнуў па-нямецку Іван. — І куды вы ведзяце гэтых людзей? Адказвайце хутка.

— Мы з ахоўнага батальёна вядзём іх расстрэльваць у кар'ер. Гэта не людзі, гэта юдэ-недачалавекі, — прамовіў эсэсавец, паказваючы дакументы і тыкаючы пальцам у спалоханых дзяўчат.

— А гэтыя двое хто? — спытаў Іван.

— А гэта палітрук і камісар, таксама падлягаюць неадкладнаму расстрэлу.

— Ты хто? — спытаў Іван, тыцнуўшы аўтаматам у грудзі маладому хлопцу з нагана на поясе.

— Я рускі, але служу Вялікай Германіі, гэта я паказаў, дзе схаваліся гэтыя камісары і юды, — растлумачыў ён.

— Гер афіцэр, спачатку можна пазабаўляцца з гэтымі дзяўчынкамі, а потым і ў яму, — угодліва лапатаў здраднік. — На ўсіх хопіць.

— Ты маладзец, за свае заслугі ты атрымаеш добры дом і карову! — паляпаў па плячы здрадніка Іван. — Вядзіце іх да кар'ера, а сабак пакуль прывяжыце да маёй машыны, яны толькі перашкаджаць будуць.

За 50 метраў ад дарогі за кустамі паказалася злавесная яма. Там ужо ляжалі расстраляныя людзі. Целы былі прысыпаны пяском.

— А ну, юды, хутка распранацца! — крычаў здраднік, каб дагадзіць немцам.

Гітлераўцы павесілі на сасну аўтаматы. Фёдар, не спяшаючыся, падышоў да іх і рэзкімі ўдарамі па горле паваліў на зямлю. Двое другіх паспелі схапіць аўтаматы, але Іван кароткай чаргой іх застрэліў.

Памагаты разгубіўся, прыціснуўся да сасны, забыў ад страху пра свой наган. Фёдар падышоў да яго, рэзка тузануў за галаву. Пачуўся хруст. Затым ён узняў яго і кінуў у яму са словамі «Вось табе, здраднік, карова і дом».

Давялося забіць і чатырох аўчарак, якія пагрозліва рычалі і не падпускалі да машыны, пабачыўшы, што няма іх гаспадароў...

Шасцёра дзяўчат залезлі ў кузаў, селі на скрыні з-пад зброі, палітрук з камісарам падрыхтавалі два кулямёты, дзясятак гранат і занялі пазіцыю каля задняга борта.

Рушылі ў дарогу. Насустрач ішлі дзясяткі нямецкіх машын. Калі паток парадзеў, Фёдар збочыў на лясную дарогу. Кіламетры праз тры спыніліся. Камандаванне на сябе ўзяў Іван.

— Нас нямала, разам з дзяўчатамі цэлая баявая адзінка. У выпадку чаго мы прымем бой. У нас ёсць зброя, — казаў ён усхваляванa. — А зараз камісару і палітруку трэба падрыхтаваць нямецкія аўтаматы да бою і раздаць іх дзяўчатам. Паскорана навучыць іх страляць. Яны зоймуць пазіцыю каля правага і левага бартоў, а вы, як і раней, паставіце кулямёты каля задняга борта. Усім надзець стальныя шлемы. Калі па дарозе сустрэнуцца немцы, Фёдар іх абгоніць і спыніцца. Калі тры разы пасігналіць — гэта прызыў да бою.

Калі ўсе занялі свае месцы ў машыне, Фёдар штыкнажом прарэзаў у брызенце па тры адтуліны вышэй за барты, каб дзяўчаты маглі страляць...

Кіламетраў праз пяць у лесе сустрэўся атрад гітлераўцаў, чалавек 40. Фёдар іх абагнаў і спыніўся, тройчы пасігналіў. Ваякі кінуліся да машыны, думаючы, што іх зараз падвязуць. Кулямёты дружна ўдарылі з задняга борта, немцы кінуліся ў лес, паабапал дарогі, але трапілі пад аўтаматныя стрэлы дзяўчат... Ніводны не сышоў адтуль. Падабраўшы зброю, паехалі далей. Непадалёк ад вёскі Вялікія Гарадзячыцы ў глухім лесе сустрэлі чырвонаармейцаў. На шчасце, абышлося без бою...

Тры дзяўчыны засталіся ў нашым атрадзе. Дзве працавалі на кухні, яшчэ адна — медсястрой. Івана і трох іншых дзяўчат перавялі ў штаб брыгады. Фёдар застаўся ў атрадзе каля машыны і выратаваных дзяўчат. Ён казаў, што яны нагадваюць яму яго дачок у далёкай Сібіры. Камісар і палітрук таксама засталіся ў нашай брыгадзе.

Вось такая дзіўная гісторыя, якая добра скончылася, адбылася ў пачатку вайны, — закончыў аповед наш праваднік Сцяпан...

Бяспека

«УБАЧЫЎ, СТРЭЛІЎ, ЗМЯНІЎ ПАЗІЦЫЮ»

Сумесная падрыхтоўка родаў войскаў і спецыяльных войскаў ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны прайшла пад Мінскам

Адбылася яна ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі ВПС і войскаў ППА. **Кіраваў ёй камандуючы Ігар ГОЛУБ.**

Тэмай сумеснай падрыхтоўкі стала правядзенне сумесных дзеянняў падраздзяленняў авіяцыйных, зенітна-ракетных, радыётэхнічных вайсковых часцей, а таксама радыёэлектроннай барацьбы падчас выканання задач па прызначэнні.

Вайскоўцы падчас заняткаў адпрацоўвалі новыя прыёмы і спосабы выкарыстання падраздзяленняў у адпаведнасці з патрабаваннямі, якія прад'яўляюцца да вядзення баявых дзеянняў у сучасных умовах.

— Мы працягваем выкананне плана мерапрыемстваў баявой падрыхтоўкі на навучальны год, — паведаміў Ігар Голуб. — Мной былі ўручаны распараджэнні камандзірам злучэнняў і воінскіх часцей на прывядзенне сваіх падраздзяленняў у павышаныя ступені гатоўнасці. Задача — пасля прывядзення выйсці ў вызначаныя раёны і ажыццявіць прыкрыццё зададзеных аб'ектаў ад атак авіяцыі ўмоўнага праціўніка. Гэта задача была выканана. Падраздзяленні здзейснілі маршы ва ўказаныя раёны і занялі пазіцыі. На другі ж дзень праводзіцца праверка гэтых падраздзяленняў палётамі кантрольных цэляў. Была створана складаная паветраная абстаноўка пры дапамозе нашай рэальнай авіяцыі. Працуем з трох стацыянарных і двух аператыўных аэрадромаў. У паветры знаходзіцца каля дзесяці цэляў. Кожнае падраздзяленне выконвае задачу па проціпаветраным прыкрыцці вызначанага аб'екта.

Узнятыя падчас сумеснай падрыхтоўкі пытанні дазволяць удасканаліць навыкі асабовага складу падчас вядзення баявой работы. Яшчэ адна задача заняткаў — дасягнуць зладжанасці дзеянняў родаў войскаў ваенна-паветраных сіл і войскаў ППА падчас выканання задач па прызначэнні, зазначылі ў Міністэрстве абароны.

На практыцы ж вайскоўцы адпрацавалі баявое выкарыстанне новых і мадэрнізаваных узораў узбраення, а таксама спецыяльнай тэхнікі ва ўмовах актыўных перашкод. Яны ставяцца падчас барацьбы з высокадакладнымі сродкамі паражэння і ўдарнымі беспілотнымі лятальнымі апаратамі. Пры гэтым улічваецца досвед вядзення сучасных лакальных канфліктаў.

Ігар Голуб адзначыў, што праверка мае шэраг асаблівасцяў.

— Па-першае, гэта работа па малавышынных малахуткасных паветраных цэлях. Гэта беспілотныя лятальныя апараты, шары-зонды, работа ва ўмовах радыёэлектроннага падаўлення. Яшчэ адна асаблівасць — работа з пастаяннай зменай баявых пазіцый.

Асноўны прынцып: убачыў, стрэліў, змяніў пазіцыю. Мы прааналізавалі тыя моцныя і слабыя бакі, якія былі выкрытыя ў ходзе баявых дзеянняў у Сірыі, Лівіі і ў Нагорным Карабаху, і ўвасабляем гэты вопыт на практыцы.

Па словах камандуючага, упершыню прымяняюцца новыя і мадэрнізаваныя ўзоры ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі.

— Комплекс аўтаматызацыі «Прастор», які быў прыняты на ўзбраенне ў канцы 2020 года, значна павысіў нашы магчымасці па кіраванні падначаленымі войскамі, па суправаджэнні і выяўленні ўсіх паветраных цэляў. Акрамя гэтага, баявым разлікам 61-й знішчальнай авіяцыйнай базы і экіпажам самалётаў-знішчальнікаў СУ-30СМ дапамагае ў рабоце найноўшая радыёлакацыйная станцыя «Сопка», — расказаў ён.

Ігар Голуб таксама адзначыў, што сёлета плануецца атрымаць на ўзбраенне такія радыёлакацыйныя станцыі, як «Сапернік-Г» і «Усход».

— Ужо заключаны кантракты на пастаўку шматфункцыянальных ударных верталётаў МІ-35, другой партыі знішчальнікаў СУ-30СМ. Акрамя таго, працягваем перадкантрактную работу па пераўзбраенні нашых дывізіёнаў зенітна-ракетных войскаў, узброеных «С-300», новымі комплексамі «С-400» і «Панцыр-С». Адначасова ў ходзе баявой работы мы выкарыстоўваем, пакуль у якасці выпрабавання, бартавыя комплексы абароны, якія актыўна дапамагаюць ставіць перашкоды, прыкрываць ударныя самалёты і верталёты ад тых сродкаў паражэння, якія па іх могуць быць выкарыстаны, — сказаў ён. — Тэхніка — гэта адно, самае галоўнае — наш састаў і яго маральны настрой. Я гатовы сцвярджаць, што ўсе ваенныя значна з'ядналіся вакол свайго галоўнакамандуючага і гатовыя выканаць любую пастаўленую задачу для захавання тэрытарыяльнай цэласнасці нашай краіны, недатыкальнасці паветранай мяжы і нашага суверэнітэту, — запэўніў Ігар Голуб.

Досвед, атрыманы асабовым складам падчас падрыхтоўкі, будзе выкарыстаны падчас сумесных аператыўных вучэнняў Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад-2021», падкрэслілі ў ваенным ведамстве.

Фота БелТА.

ВЕРНУТАЯ ПАМЯЦЬ

У 2020 годзе ў аўтаматызаваны банк даных «Кніга Памяці Рэспублікі Беларусь» унесены звесткі пра больш чым 14 тысяч чалавек, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Пра гэта паведаміў падчас круглага стала ў прэс-цэнтры БелТА **вядучы спецыяліст упраўлення па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Беларусі Аляксандр ЛУГІН.**

Спецыяліст адзначыў, што на дзяржаўны ўлік прынята 49 воінскіх пахаванняў і 52 пахаванні ахвяр войнаў. Усяго ж на дзяржаўным уліку на 31 снежня 2020 года значыцца 7867 воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войнаў. У аўтаматызаваны банк даных унесены ўліковыя запісы пра месцы пахавання больш чым 2 млн 88 тысяч загінулых, але звесткі вядомыя пра больш чым 538 тысяч...

Летась асабовы склад 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна даследаваў 94 пошукавыя аб'екты.

«Пошукавыя работы на 64 з іх былі выніковыя. Гэта значыць, знойдзены астанкі загінулых. Мясцовым выканаўчым і распарадчым органам для перапахавання перададзены астанкі 878 загінулых (ваеннаслужачых РСЧА — 600, ахвяр вайны — 273, удзельнікаў Супраціўлення — 5). У ходзе пошукавых работ нам удалося высветліць імёны 28 загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны», — адзначыў спецыяліст.

Таксама падчас раскопак былі выяўлены восем узнагарод (ордэн Айчыннай вайны I ступені, ордэн Айчыннай вайны II ступені, два медалі «За адвагу» і чатыры — «За баявыя заслугі»), 52 медальёны, 12 адзінак стралковай зброі, 156 выбухованебяспечных прадметаў, 7636 патронаў і 1838 іншых знаходак.

Самыя буйныя аб'екты пошуку па колькасці вынятых астанкаў — вёска Палойнікі Віцебскага раёна (39 ваеннаслужачых РСЧА і 147 ахвяр вайны), Мінск (Масюкоўшчына — 144 ваеннапалонныя «Шталаг № 352»), вёска Новікі Віцебскага раёна (42 ваеннаслужачыя РСЧА), вёска Сосенка Стаўбцоўскага раёна (26 ваеннаслужачых РСЧА).

УМЕННІ ПРАВЕРАЦЬ НА ПРАКТЫЦЫ

Ва Узброеных Сілах пачалася комплексная праверка баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці. Праводзіцца яна пад кіраўніцтвам начальніка Генеральнага штаба — першага намесніка міністра абароны. Пра гэта паведамілі ў ваенным ведамстве.

Асноўная мэта комплекснай праверкі — павышэнне ўзроўню баявой і мабілізацыйнай гатоўнасці і здольнасці злучэнняў і вайсковых часцей выконваць свае задачы па прызначэнні ў сучасных умовах.

— Дзеянні войскаў пройдуць практычна на ўсіх палігонах Узброеных Сіл і асобных участках мясцовасці. Улічваючы спецыфіку задач, якія будуць выконвацца, войскам трэба будзе дзейнічаць у розных умовах — пераадольваць водныя перашкоды, адпрацоўваць вучэбна-баявыя задачы днём і ноччу як у лясных масівах, так і ў населеных пунктах, — адзначылі ў Міністэрстве абароны.

Завяршыць праверку плануецца правядзеннем кантрольных заняткаў і тактычных вучэнняў з баявой стральбой рознага ўзроўню.

НОВАЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

Са жніўня 2021 года Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту будзе рыхтаваць спецыялістаў па новым кірунку — «Тэхнічная эксплуатацыя аўтамабіляў (ваенная аўтамабільная тэхніка)». Выпускнікі, якія паспяхова асвояць спецыяльнасць, атрымаюць кваліфікацыю «інжынер-механік — спецыяліст па кіраванні».

— Мяркуецца, што акцэнт у падрыхтоўцы курсантаў будзе зроблены на выкарыстанні аўтамабільных падраздзяленняў, — адзначылі ў Міністэрстве абароны. — Аўтамабільная тэхніка ва Узброеных Сілах задзейнічана вельмі шырока. Яе выкарыстоўваюць для перавозкі асабовага складу і грузаў, прымяняюць у якасці базавага шасі для мантажу найноўшых сістэм узбраення, камандных пунктаў, пунктаў кіравання беспілотнай авіяцыяй.

Набор абітурыентаў па новай спецыяльнасці пачнецца ўжо гэтым летам. Курсанты будуць навучацца ў інтарэсах транспартных войскаў і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у цэлым.

Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

КАМФОРТНАЕ ЖЫЛЛЁ І СПРЫЯЛЬНАЕ АСЯРОДДЗЕ

Аднайменная дзяржпраграма дазволіць павысіць якасць камунальных паслуг і наблізіць да Мэты-99

Дзеянне праграмы разлічана да 2025 года, яна з'яўляецца адным з інструментаў рэалізацыі асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку. Днямі аб праекце профільнай дзяржпраграмы журналістам падчас прэспрэзентацыі расказаў міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй ХМЕЛЬ.

Ён звярнуў увагу, што ўсе праграмныя дакументы развіцця ЖКГ узаемазвязаныя, і сам праект дзяржпраграмы складаецца з сямі падпраграм, у шасці з якіх адказным заказчыкам выступае профільнае міністэрства. Якія гэта падпраграмы? Даступнасць паслуг, добраўпарадкаванне, эфектыўнае цеплазабеспячэнне, рамонт жылля, чыстая вада і Мэта-99.

— Укараненне механізма нарматыўнага фінансавання па планава-разліковых цэнах, а таксама работа, якая праводзіцца па стрымліванні росту выдаткаў, дазволілі забяспечваць фарміраванне тарыфаў на паслугі ЖКГ у вызначаных межах, — падкрэсліў кіраўнік ведамства.

Ён звярнуў увагу на празрысты і зразумелы для грамадзян механізм, які цалкам апраўдаў сябе.

— Па ўсіх паслугах, якія аказваюцца ЖКГ (за выключэннем паслуг па падагрэве вады і ацяпленні), у цэлым забяспечана поўная акупнасць плацяжамі насельніцтва. Зыходзячы з гэтага, узровень кампенсацыі насельніцтвам затрат па паслугах ЖКГ паводле вынікаў мінулага года ацэньваецца на ўзроўні 83,2 працэнта, — акцэнтаваў увагу Андрэй Хмель.

Трэба сказаць, што аплата паслуг ЖКГ у структуры выдаткаў беларусаў займае адносна невысокую ўдзельную вагу. У 2016—2020 гадах на гэтыя мэты з сямейнага бюджэту траціцца ў сярэднім ад 4,7 % да 4,9 % (пры двух дарослых, якія працуюць і атрымліваюць сярэднерэспубліканскі заробак).

Пры гэтым у краіне эфектыўна дзейнічае сістэма безнаяўных жыллёвых субсідый на жыллёва-камунальныя паслугі.

Штогод у Беларусі ўтвараецца каля 3,8 мільёна тон камунальных адходаў. Больш за 80 % аб'ёму камунальных адходаў — гэта адходы спажывання, якія штодзень ствараем мы з вамі, выкідаючы смецце ў бытавыя кантэйнеры.

Між іншым, жыхары суседняй Прыбалтыкі выдаткоўваюць на камунальныя паслугі ад 20 % да 35 % штомесячнага заробку, сярэднестатыстычны расіянін аддае на камунальныя плацяжы 10,8 % бюджэту сям'і, украінец — 42 % даходаў.

Што датычыцца добраўпарадкавання, у рамках рэалізацыі дзяржпраграмы ствараецца камфортная для жыхароў краіны інфраструктура, вуліцы і гарадскія грамадскія прасторы прыводзяцца да фармату, які адпавядае сучасным тэндэнцыям, ствараюцца новыя магчымасці для адпачынку суайчыннікаў.

За два гады праведзены рамонт (добраўпарадкаванне) каля васьмі тысяч прыдамавых тэрыторый, паведаміў міністр. Праграмай прадугледжаны рамонт двух працэнтаў дваровых тэрыторый штогод.

Дровы, трэскі і брыкет

— Цяпло ў нашых дамах — яшчэ адзін важны аргумент стабільнасці функцыянавання арганізацый ЖКГ, якія падтрымліваюць у спраўным стане вялікую колькасць кацельных і цеплавых сетак у гарадах і сёлах, забяспечваючы надзейнае цеплазабеспячэнне ў ацяпляльны перыяд, — адзначыў кіраўнік ведамства.

Па яго словах, заданне па замене неэфектыўных цеплавых сетак забяспечана ў аб'ёме не менш як чатыры працэнты ад іх працягласці штогод. У выніку страты цеплавой энергіі пры яе транспартаванні скарацілася з 13,8 % у 2015 годзе да 10,0 % летась. Дзяржпраграмай прадугледжана мінімізацыя страт цеплавой энергіі ў 2025 годзе да ўзроўню дзевяці працэнтаў.

Акрамя таго, у гэтай пяцігодцы працягнецца рэканструкцыя цеплавой гаспадаркі з пераводам яе на выкарыстанне мясцовых відаў паліва. Ужо цяпер на сваіх рэсурсах працуе больш за 72 працэнты кацельняў ЖКГ (2747 на МВП з 3810 кацельняў). Будаўніцтва яшчэ 64 кацельняў, распачатае ў 2020 годзе, дазволіць забяспечыць долю выкарыстання мясцовых відаў паліва больш за 52 %.

Адрамантавалі 12 мільёнаў «квадратаў»

— Утульнасць і камфортныя ўмовы пражывання — тое, да чаго імкнецца кожны чалавек, незалежна ад месца жыхарства. У большай ступені клопат аб забеспячэнні такіх умоў ляжыць на жыллёва-эксплуатацыйных службах, у чые непасрэдныя абавязкі ўваходзіць утрыманне і эксплуатацыя жылфонду, — перакананы міністр.

Ён адзначыў, што павелічэнне аб'ёмаў капітальнага рамонту жылых дамоў дазволіла не дапусціць пагаршэння тэхнічнага стану жылля. Так, у 2016—2020 гадах капітальна адрамантавана больш за 12 мільёнаў «квадратаў» жылля.

Трэба сказаць, што ў апошнія гады аб'ёмы ўводу ўвесь час павялічваліся, што дало магчымасць давесці ўзровень капрамонту звыш 2,7 % ад плошчы, якая абслугоўваецца камунальнікамі.

— Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму па штогадовым павелічэнні аб'ёмаў уводу жылля пасля капітальнага рамонту да 3 % ад плошчы жыллёвага фонду, якая эксплуатуецца, — падкрэсліў Андрэй Хмель. — Для гэтага сёлета будзе выкананы капітальны рамонт не менш за 3,5 мільёна квадратных метраў жылля.

Акрамя рамонту жылля, важным складнікам ацэнкі эфектыўнасці дзейнасці сістэмы ЖКГ з'яўляецца замена старых ліфтаў, якія адпрацавалі свой тэрмін эксплуатацыі. Так, напрыклад, у 2020 годзе завершана трохгадовая праграма і выканана даручэнне кіраўніка дзяржавы па паскоранай замене да 2021 года ў шматкватэрных жылых дамах усіх ліфтаў, якія адпрацавалі нарматыўныя тэрміны эксплуатацыі. Пры заданні дзяржпраграмы па замене на пяцігодку 11 298 ліфтаў заменена 11 511 ліфтаў, паведаміў міністр.

Па яго словах, за новую пяцігодку плануецца замяніць 4727 ліфтаў, якія адслужылі нарматыўны тэрмін.

Вада павінна быць чыстая

Як адзначыў кіраўнік ведамства, аналізуючы вынікі падпраграмы «Чыстая вада», у краіне забяспечана даступнасць пітной вады для насельніцтва, але ў той жа час у асобных населеных пунктах пакуль захоўваецца праблема яе якасці. А гэта, зразумела, адбіваецца на здароўі грамадзян.

— Дзякуючы сістэмнай рабоце па забеспячэнні да 2025 года ўсіх спажыўцоў якаснай пітной вадой доступ да яе ўжо атрымала больш за 200 тысяч чалавек, якія жывуць пераважна ў сельскай мясцовасці, — падкрэсліў кіраўнік ведамства.

Трэба сказаць, што калі на працягу 2016—2018 гадоў у цэлым па краіне пабудавалі 60 станцый абезжалезвання, то ў 2019 годзе з'явілася ўжо 269 такіх станцый, у 2020 — 277. У выніку толькі за апошнія два гады забяспечанасць спажыўцоў якаснай пітной вадой павялічылася больш чым на восем працэнтных пунктаў і склала 94,2 %.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Вынік комплекснай і сістэмнай дзейнасці па зборы ДМР у нашай краіне летась склаў каля 25 % ад аб'ёму ўтварэння адходаў. У 2025 годзе выкарыстанне ЦКА ад агульнага аб'ёму іх утварэння плануецца на ўзроўні 64 %, падзяліўся планамі міністр. І гэта не мяжа — у ідэале, канешне, дасягнуць такога ўзроўню сартавання і перапрацоўкі, каб 99 % смецця атрымлівала другое жыццё».

Міністр звярнуў увагу і на планамернасць замены зношаных сетак водазабеспячэння і водаадвядзення ў аб'ёме не менш за тры працэнты ад іх працягласці. Штогод перакладваецца больш за 300 кіламетраў сетак водазабеспячэння і больш за 100 кіламетраў сетак водаадвядзення са звышнарматыўнымі тэрмінамі эксплуатацыі. У планах на будучую пяцігодку — такія ж тэмпы, за пяць гадоў будзе перакладзена каля дзвюх тысяч кіламетраў сетак водазабеспячэння і каля тысячы кіламетраў сетак водаадвядзення. А гэта, у сваю чаргу, надзейнае водазабеспячэнне і водаадвядзенне, змяншэнне колькасці аварый.

— Нам трэба будзе пабудаваць больш за 800 станцый абезжалезвання вады, больш за 300 водазаборных свідравін, перападключыць больш за 100 населеных пунктаў да наяўных цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння з вадой пітной якасці, перавесці Мінск на водазабеспячэнне з падземных крыніц, а таксама павысіць якасць ачысткі сцёкавых вод шляхам будаўніцтва, рэканструкцыі 70 ачышчальных збудаванняў, — падзяліўся планамі на пяцігодку міністр ЖКГ.

Што за Мэта-99?

Штогод у Беларусі ўтвараецца каля 3,8 мільёна тон камунальных адходаў. Больш за 80 % аб'ёму камунальных адходаў — гэта адходы спажывання, якія штодзень ствараем мы з вамі, выкідаючы смецце ў бытавыя кантэйнеры.

«Трэба сказаць, што аплата паслуг ЖКГ у структуры выдаткаў беларусаў займае адносна невысокую ўдзельную вагу. У 2016—2020 гадах на гэтыя мэты з сямейнага бюджэту траціцца ў сярэднім ад 4,7 % да 4,9 %».

— Сістэма абыходжання з ЦКА ўвесь час развівалася і ўдасканальвалася. Сёння яна ахоплівае ўсю тэрыторыю Беларусі і забяспечвае ў цэлым бяспечны для чалавека і навакольнага асяроддзя збор і выдаленне ЦКА, а таксама выманне з іх складу другасных матэрыяльных рэсурсаў, — кажа Андрэй Хмель.

Па яго словах, за апошнія пяць гадоў значна пашырылася і мадэрнізавалася сістэма паасобнага збору і сартавання ЦКА і нарыхтоўкі ДМР: з'явілася больш за 60 тысяч кантэйнераў для збору ЦКА і ДМР у шматкватэрнай і больш за 450 тысяч у індывідуальнай жылой забудове, закуплена больш за 200 смеццявозаў.

Між іншым, з'яўляюцца новыя для Беларусі кірункі выкарыстання ЦКА. Напрыклад, створана вытворчасць па перапрацоўцы батарэек у ААТ «БелВТІ» і вядзецца работа па вырабе і выкарыстанні паліва з камунальных адходаў для цэментных заводаў (RDF-паліва).

Трэба адзначыць, што вынік комплекснай і сістэмнай дзейнасці па зборы ДМР у нашай краіне летась склаў каля 25 % ад аб'ёму ўтварэння адходаў. У 2025 годзе выкарыстанне ЦКА ад агульнага аб'ёму іх утварэння плануецца на ўзроўні 64 %, падзяліўся планамі міністр. І гэта не мяжа — у ідэале, канешне, дасягнуць такога ўзроўню сартавання і перапрацоўкі, каб 99 % смецця атрымлівала другое жыццё.

— Для дасягнення гэтага паказчыка вядзецца работа не толькі над павелічэннем аб'ёмаў збору традыцыйных відаў ДМР, але і над укараненнем тэхналогій апрацоўкі арганічнай часткі камунальных адходаў (кампаставання) і вырабу і выкарыстання RDF-паліва, — растлумачыў Андрэй Хмель.

Што для гэтага трэба? Стварыць 16 рэгіянальных аб'ектаў па сартаванні і выкарыстанні ЦКА і палігонаў для іх пахавання да 2025 года. Усяго да 2030 года плануецца пабудаваць каля 30 рэгіянальных аб'ектаў.

Што гэта дасць? З'явіцца магчымасць сартаваць практычна ўсе камунальныя адходы і выкарыстоўваць з іх не толькі традыцыйныя другасныя матэрыяльныя рэсурсы (напрыклад, шкло, паперу, пластык і гэтак далей), але і вырабляць паліва для цэментных заводаў і кацельняў, а таксама кампаставаць і выкарыстоўваць арганічную частку.

Акрамя таго, з'явіцца магчымасць стварыць аб'ект па энергетычным выкарыстанні адходаў у Мінску. Гэта дазволіць знізіць аб'ёмы захавання ЦКА на 10—15 % у маштабах краіны і імпарту прыроднага газу на 115 мільёнаў кубаметраў штогод.

— У аснове праграмы ляжыць клопат пра спажыўцоў паслуг ЖКГ, а адпаведна, клопат аб кожным грамадзяніне нашай краіны, — падкрэсліў міністр. — Я ўпэўнены, што рэалізацыя дадзенай праграмы дазволіць стварыць для ўсіх камфортныя ўмовы пражывання.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

НАЙЛЕПШЫ СЯБАР СУЧАСНАГА ЧАЛАВЕКА

Якую шкоду наносіць смартфон?

Як часта вы карыстаецеся сваім мабільным тэлефонам? Раз у дзень ці два? Мноства людзей практычна не выпускаюць мабільнікі з рук. Але ці толькі карысць прыносіць нам такі звыклы прадмет, як мабільны тэлефон? Пра гэта мы паразмаўлялі з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозга РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГУРБАНІДЖАДАМ.

— Мабільны тэлефон настолькі шчыльна ўвайшоў у наша жыццё, што ўявіць сябе без яго немагчыма. Праз яго мы прызвычаіліся вырашаць многія рэчы. Нават некаторыя медыцынскія ўстановы звязваюцца са сваімі пацыентамі праз мабільныя тэлефоны, ці маецца кнопка SOS для аказання медыцынскай дапамогі. Ёсць мабільныя праграмы, якія дазваляюць адсочваць, ці выконвае хворы на COVID-19 каранцін, — кажа ўрач. — Калі гадоў 30 таму мы мусілі браць з сабой у адпачынак фотаапарат, калькулятар, радыё, магнітафон і яшчэ шмат чаго, то сёння ўсе гэтыя функцыі выконвае мабільны тэлефон. Ён замяняе банкаўскія карты, ключы і іншыя прадметы. Але, натуральна, любая рэч — палка з двума канцамі. Са з'яўленнем мабільнага тэлефона з'явіліся і новыя праблемы.

Ім прысвечана шмат навуковых работ. У першую чаргу многіх хвалюе апрамяненне. Электрамагнітнае поле мабільнага тэлефона нават параўноўвалі з такім у мікрахвалевай печы, дзе ўсё смажыцца. Насамрэч электрамагнітнае поле мабільнага тэлефона нашмат меншае і не мае такога моцнага ўплыву. Але адна справа, калі мы за ўвесь дзень размаўляем сумарна паўгадзіны, і іншая справа, калі гэта некалькі гадзін. Можна сказаць, што такое доўгае ўздзеянне апрамяненнем тэарэтычна можа выклікаць нейкія змяненні галаўнога мозга. Тое, што гэта выклікае ракавыя захворванні галаўнога мозга, не даказана. Аднак ёсць пэўныя навуковыя работы, якія звязваюць доўгае выкарыстанне мабільнага тэлефона з утварэннем пухлін галаўнога мозга. Праўда, тут важна сказаць, што для таго, каб у галаўным мозгу ўтварылася пухліна, павінна сысціся шмат фактараў, у тым ліку вірусных, генетычных. Аднаго мабільнага тэлефона недастаткова.

— Ці ёсць шкода, калі ён ляжыць побач з падушкай падчас нашага сну?

— Калі ў нас няма неабходнасці размаўляць, лепш трымаць яго на адлегласці. Не выкарыстоўваць будзільнік мабільнага тэлефона і не класці яго на ноч побач. Таксама непажадана размаўляць па мабільным тэлефоне, калі ён стаіць на зарадцы — апрамяненне павялічваецца. Той факт, што ён змяншае выпрацоўку сперматазоідаў у мужчын, калі насіць тэлефон у кішэні штаноў, не даказаны.

— Як мабільны тэлефон уплывае на нашу постаць?

— Чым больш наша галава нахіляецца наперад, тым больш павялічваецца нагрузка на шыйны аддзел пазваночніка. Пры нахіле галавы на 15 градусаў нагрузка на пазваночнік складае прыкладна 12 кілаграмаў, на 30 — 18 кілаграмаў, а пры 60 градусах дасягае 27 кілаграмаў. А між іншым, нахіл у 60 градусаў — самая звыклая поза з мабільным. Адна справа, калі трэба завязаць шнуркі, і іншая, калі вы седзіце цэлую гадзіну ці некалькі, нахіліўшыся да мабільнага тэлефона — глядзіце кіно ці чытаеце сацыяльныя сеткі. Мала таго, што вялікая нагрузка ідзе на шыйны аддзел, дык з-за нязручнай позы парушаецца кровазварот шыйнага аддзелу пазваночніка. А доўгае парушэнне кровазвароту паскарае развіццё астэахандрозу, ідзе парушэнне сілкавання, расцягваюцца звязкі, і мы такім чынам заўчасна зношваем шыйны аддзел пазваночніка. Калі ён мог бы без праблем служыць нам гадоў 60—70, то тут болі пачынаюць з'яўляцца ў 30—40 гадоў і нават раней.

Таму лепш максімальна пазбягаць доўгага выкарыстання мабільнага тэлефона. Калі хочаце пасядзець у інтэрнэце, паглядзець кіно, пагуляць, лепш не рабіць гэта праз мабільны тэлефон, а прыйсці дадому і ўключыць камп'ютар. Тут важна, каб манітор правільна стаяў перад вамі, тады ён не так моцна, як тэлефон, уплывае на зрок, шыя не нахіляецца ўніз. Зразумела, што не цярпіцца даглядзець серыял, але дачакайцеся, пакуль даедзеце дадому, і глядзіце лепш на вялікім экране камп'ютара ці тэлевізара. У камп'ютарныя гульні таксама ніхто 5—10 хвілін не гуляе, гэта паўгадзіны—гадзіна. І якая постаць будзе ў гэтага чалавека? Падлеткам і маладым людзям уласціва жыць сённяшнім днём, а не думаць, што будзе праз дзесяць гадоў. Таму адказнасць за іх здароўе ляжыць на бацьках.

Часта назіраю, калі маці ў чарзе да ўрача дае дзіцяці мабільны тэлефон, і яно сядзіць, ссутуліўшыся, галавой уніз. Для мамы гэта камфортна і зручна. Але ўявіце, якія ў гэтага дзіцяці будуць зрок і постаць. Натуральна, калі ў гэтым узросце з'явіцца кіфоз ці скрыўленне шыйнага аддзелу пазваночніка, гэта праблема да канца жыцця. Таму для дзіцяці павінен быць рэжым: выкарыстоўваеш тэлефон пэўную колькасць хвілін у дзень і не больш. Бацькам трэба сачыць за гэтым, пакуль арганізм расце і развіваецца, каб у будучым чалавек без мабільнага тэлефона не выглядаў так, як быццам бы ён у яго руках.

Калі дзіця павінна быць пастаянна на сувязі, то лепш набываць самы просты кнопачны тэлефон. Важна растлумачыць дзіцяці, што нельга карыстацца мабільным тэлефонам, калі пераходзіш дарогу, бо трэба звяртаць увагу на тое, што адбываецца на дарозе, а не ў мабільным тэлефоне. Асобная тэма — вучыцца дзецям і падлеткам кантактаваць у рэальным, а не віртуальным свеце і сацсетках.

— Якія яшчэ праблемы звязаны з выкарыстаннем мабільнага тэлефона?

— Адна з іх — з вестыбулярным апаратам. Гэта частка ўнутранага вуха, якая ўспрымае змяненні становішча галавы і цела ў прасторы і напрамкі руху цела, папросту кажучы, арыентуе нас у прасторы. Калі мы рухаемся ў ліфце, сценкі ліфта ні наверх, ні ўніз не едуць, але мы адчуваем, куды рухаецца ліфт. Калі паназіраеш, як студэнты выходзяць з будынка ўніверсітэта, заўважыш, што многія ідуць, утаропіўшыся ў тэлефон. Такая хадзьба выклікае галавакружэнне і млоснасць. Калі гэта зіма і галалёд, то гэта яшчэ і праблемы, звязаныя з атрыманнем траўмаў.

Яшчэ адна праблема — парушэнне біярытмаў нашага арганізма — дзённага і начнога рэжымаў. Нягледзячы на тое, што ёсць розныя праграмы, якія ўначы прыглушаюць колер на экране, некаторыя вучоныя лічаць, што сам мабільны тэлефон мяняе біярытмы. А гэта парушэнне сну і работы галаўнога мозга, ператамленне, дэпрэсія. Таму калі мы хочам пачытаць перад сном, замест мабільнага тэлефона лепш выкарыстоўваць электронную кнігу. Яна не так моцна напружвае вочы, бо мае эфект паперы, і не парушае біярытмы.



Наступная праблема — з рукамі. У артапедыі лічыцца, што стэназуючы лігаментыт і тэндавагініт сустракаюцца ў дачнікаў і піяністаў, таксама іх могуць выклікаць гаджэты, у прыватнасці, мабільны тэлефон. Пры лігаментыце вялікі палец пачынае шчоўкаць, як каробка перадач, тэндавагініт — запаленне сухажылляў. Нашы рукі больш разлічаны на хапальныя рухі, а не на ратацыю. Доўгае выкарыстанне мабільнага тэлефона, перапіска, гартанне старонак можа прыводзіць да хранізацыі захворвання і частага абвастрэння.

У медыцыне пастаянна даводзіцца ваяваць з бактэрыямі і мікраарганізмамі. Многія нашы хваробы ад таго, што яны трапляюць у арганізм. Таму мы мыем рукі перад ужываннем ежы, а вось мабільны тэлефон звычайна не апрацоўваем і не мыем. Гэта тэхнічна складана, ды і многія баяцца гэта рабіць, бо аддалі за яго вялікія грошы. Па некаторых даных мабільны тэлефон, калі яго не праціраць, у восем-дзесяць разоў бруднейшы за ўнітаз. Атрымліваецца, што перад абедам мы мыем рукі, потым звоніць тэлефон, мы размаўляем — пасля зноў узялі хлеб і працягваем абедаць. Асабліва гэта характэрна для дзяцей і падлеткаў, якія часта не выпускаюць мабільны тэлефон з рук. Павялічваецца колькасць інфекцыйных хвароб, якія перадаюцца праз брудныя рукі ў страўнікава-кішачны тракт.

Натуральна, калі мы падносім да твару мабільны тэлефон, прыкладваем яго да шчакі некалькі разоў за дзень, павялічваецца верагоднасць утварэння прышчыкаў і інфекцыйных захворванняў скуры, прычым дзіцячая скура больш уразлівая. Гэтыя небяспекі таксама трэба мець на ўвазе, асабліва цяпер, калі распаўсюджваецца каранавірус.

— Ці ёсць дадатковая небяспека для цяжарных жанчын?

— Цяжарнасць — вялікае выпрабаванне для пазваночніка жанчыны. Калі дадаць нагрузку на шыйны аддзел, пасля родаў будзе праблема не толькі з паяснічным, але і з шыйным аддзелам. Увесь гэты час пазваночнік больш уразлівы, бо дзіця забірае ў мамы кальцый, і пасля кожнай цяжарнасці шкілет становіцца больш крохкім. Акрамя таго, у першыя тры месяцы цяжарнасці лічыцца, што дзіця менш абаронена, напрыклад, у першым трыместры не прызначаюць пэўныя групы прэпаратаў. Улічваючы апрамяненне, многія ўрачы не рэкамендуюць, каб мама трымала ў кішэні побач з жыватом мабільны тэлефон, спала з ім, увогуле раяць, каб менш мела з ім кантактаў.

Адзін пацыент у мяне спытаў: што рабіць, каб менш спаць, бо жыццё кароткае і хочацца ўсё паспець. Сон нам неабходны — адбываецца перазагрузка і аднаўленне нервовай сістэмы. І калі чалавек некалькі дзён не спіць, ён можа загінуць. А колькі гадзін штодзень мы праводзім у мабільным тэлефоне? Гэта пустыя затраты часу: гульні, інтэрнэт, сацыяльныя сеткі. І яго можна патраціць на сваё развіццё, навучанне, а не на непатрэбныя нам рэчы. Тэлефон насамрэч неабходны толькі для таго, каб падзяліцца і атрымаць пэўную інфармацыю — і ўсё.

На слыху

САЗ: «Цалкам перамагчы COVID-19 не ўдасца»?

Нягледзячы на прагрэс у барацьбе з каранавірусам, перамагчы яго будзе складана, заявіў выканаўчы дырэктар праграмы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (САЗ) па надзвычайных сітуацыях у галіне аховы здароўя Майкл Раян на брыфінгу. Ён не выключыў, што COVID-19 стане эндэмічным захворваннем — цалкам ліквідаваць яго наўрад ці атрымаецца.

«Чалавецтва змагло перамагчы пакуль толькі воспу», — сказаў Раян. Ліквідаваць жа такія хваробы, як поліяміэліт і адзёр, да гэтага часу не ўдалося. Гэтак жа і з каранавірусам справіцца будзе няпроста: у прыватнасці, таму што COVID-19 распаўсюджваецца амаль ва ўсіх краінах свету, а доступ да вакцыны пакуль ёсць не ва ўсіх. У краін ёсць магчымасць знізіць смяротнасць ад COVID-19 і вярнуцца да нармальнага жыцця, але захворванне застанецца, калі вакцынацыя не будзе ўсеагульнай.

Кіраўнік САЗ Тэдрас Гебрэесус на брыфінгу заявіў, што будзе «маральная катастрофа, калі мы не забяспечым роўны доступ да вакцын». Прычым не толькі маральная, але і эканамічная. З-за пандэміі летась было страчана 8,8 % рабочых гадзін, а гэта прывяло да скарачэння даходаў у памеры 3,7 трыльёна долараў ва ўсім свеце. Ён папярэдзіў, што «вакцынны нацыяналізм» можа каштаваць сусветнай эканоміцы больш за 9 трыльёнаў долараў, прычым палова гэтай сумы — 4,5 трыльёна — прыпадзе на развітыя краіны. Тэдрас Гебрэесус канстатаваў, што пакуль найбольш забяспечаныя краіны паступова разгортваюць вакцынацыю, бедныя толькі назіраюць за гэтым.

На цяперашні момант у ЕС і ЗША адобрана прымяненне вакцыны супраць каранавіруса Pfizer / BioNTech. У Расіі зарэгістраваны і ўжываюцца дзве вакцыны — «Спадарожнік V» і «ЭпіВакКарона». Па звестках Універсітэта Джонса Хопкінса, колькасць выяўленых выпадкаў каранавіруса ў свеце набліжаецца да 100 мільёнаў, памерла больш за 2,1 мільёна чалавек.

Лідарам па колькасці пацверджаных выпадкаў застаюцца ЗША, дзе выявілі больш за 25 мільёнаў захварэлых. Індыя знаходзіцца на другім месцы (10,6 мільёна), на трэцім — Бразілія (больш за 8,8 мільёна), на чацвёртым — Расія (3,73 мільёна), на пятым — Вялікабрытанія (3,6 мільёна).

МЕСЯЧНЫ ПАСЯЎНЫ

Пасадка — найважнейшы перыяд для ўдалага развіцця расліны. Гэта пачатак жыццёвага цыкла, і менавіта ён уплывае на колькасць і якасць ураджаю.

Высадка раслін і перасаджванне ў большай ступені залежаць ад месячнай фазы і ў меншай — ад задыякальных сузор'яў.

НАЙЛЕПШЫЯ ДНІ ДЛЯ ПАСАДКІ І СЯЎБЫ РАСЛІН

Расліна	Студзень	Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
АГАРОДНІННЫЯ КУЛЬТУРЫ												
Агуркі	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 7, 8, 15-25, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16 19-21, 24-30	7-13, 16, 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Баклажаны	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 7, 8, 15-25, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16 19-21, 24-30	7-13, 16, 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Бульба, тапінамбур	27	2-5, 7-9, 20-24	1, 3-5, 8, 13-15, 19, 28	1, 3, 5, 8, 9, 13, 15-19, 27, 28	1, 2, 5, 13, 15-17, 20, 24, 28, 29	2, 3, 6-8, 11-13, 16, 21-25, 29, 30	4-8, 13-15, 19-23, 26-28, 31	1-6, 10-12, 15, 17-19, 23, 24, 30, 31	1, 8-11, 13, 14, 18, 19, 24, 25, 29, 30	3, 7-9, 12, 13, 16, 17, 21, 22, 26, 27, 31	2, 3, 8, 9, 13, 14, 17-19, 22-24, 29, 30	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30
Буракі	27	2-5, 7-9, 20-24	1, 3-5, 8, 13-15, 19, 28	1, 3, 5, 8, 9, 13, 15-19, 27, 28	1, 2, 5, 13, 15-17, 20, 24, 28, 29	2, 3, 6-8, 11-13, 16, 21-25, 29, 30	4-8, 13-15, 19-23, 26-28, 31	1-6, 10-12, 15, 17-19, 23, 24, 30, 31	1, 8-11, 13, 14, 18, 19, 24, 25, 29, 30	3, 7-9, 12, 13, 16, 17, 21, 22, 26, 27, 31	2, 3, 8, 9, 13, 14, 17-19, 22-24, 29, 30	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30
Гарох, фасоля, чачавіца, бабы	27, 30, 31	2, 4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	1, 3, 5, 8-10, 13, 15-22, 24-28	1, 2, 5-7, 10-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 6-8, 15-26, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28, 31	1, 5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 6-13, 15, 16 19-21, 24-30	6-13, 16-22, 26, 27, 31	2, 3, 6-14, 17-19, 23, 24, 29, 30	1, 2, 5-11, 14-21, 29-31
Кабачкі, патысоны, гарбузы	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 6-8, 15-26, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16 19-21, 24-30	7-13, 16, 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29-31
Кавуны, дыня	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 7, 8, 15-25, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16 19-21, 24-30	7-13, 16, 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Капуста белакачанная ранняя	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 7, 8, 15-25, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16 19-21, 24-30	7-13, 16 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Капуста белакачанная сярэдняспелая, позняя	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 7, 8, 15-25, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16 19-21, 24-30	7-13, 16 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Кроп, пятрушка, сельдэрэй, цыбуля на зяленіва	27, 30, 31	2, 4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	1, 3, 5, 8-10, 13, 15-22, 24-28	1, 2, 5-7, 10-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 6-8, 15-26, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28, 31	1, 5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 6-13, 15, 16 19-21, 24-30	6-13, 16-22, 26, 27, 31	2, 3, 6-14, 17-19, 23, 24, 29, 30	1, 2, 5-11, 14-21, 29-31
Кукуруза, соя	27, 30, 31	1-5, 7-9, 12-14, 17-25, 27, 28	1-5, 8, 13-22, 24-28	1, 3, 5, 8-10, 13, 15-22, 24-30	1, 2, 5-7, 10-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 6-8, 15-26, 29, 30	4, 7-10 13-17, 19-23, 27, 28, 31	1-6, 10-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 6-13, 15, 16 19-21, 24-30	6-13, 16-22, 26, 27, 31	2, 3, 6-14, 17-19, 23, 24, 29, 30	1, 2, 5-11, 14-21, 29-31
Морква	25-27	2-5, 7-9, 20-24	1, 3-5, 8, 13-15, 19, 28	1, 3, 5, 8, 9, 13, 15-19, 27, 28	1, 2, 5, 13, 15-17, 20, 24, 28, 29	2, 3, 6-8, 11-13, 16, 21-25, 29, 30	4-8, 13-15, 19-23, 26-28, 31	1-6, 10-12, 15, 17-19, 23, 24, 30, 31	1, 8-11, 13, 14, 18, 19, 24, 25, 29, 30	3, 7-9, 12, 13, 16, 17, 21, 22, 26, 27, 31	2, 3, 8, 9, 13, 14, 17-19, 22-24, 29, 30	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30
Салата, шпінат, мангольд	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 7, 8, 15-25, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16 19-21, 24-30	7-13, 16, 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Памідоры	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 7, 8, 15-25, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16, 19-21, 24-30	7-13, 16, 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Перац салодкі, горкі	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 7, 8, 15-25, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16, 19-21, 24-30	7-13, 16, 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Пятрушка, сельдэрэй на корань	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13, 15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 7, 8, 15-25, 29, 30	4, 7, 13-17, 19-23, 27, 28	5, 6, 10-15, 17-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 8-13, 15, 16 19-21, 24-30	7-13, 16, 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Радыска, рэпа, рэдзька, бручка	27	2-5, 7-9,20-24	1, 3-5, 8, 13-15, 19, 28	1, 3, 5, 8, 9, 13, 15-19,27, 28	1, 2, 5, 13, 15-17, 20, 24, 28, 29	2, 3, 6-8, 11-13, 16, 21-25, 29, 30	4-8, 13-15, 19-23, 26-28, 31	1-6, 10-12, 15, 17-19, 23, 24, 30, 31	1, 8-11, 13, 14, 18, 19, 24, 25, 29, 30	3, 7-9, 12, 13, 16, 17, 21, 22, 26, 27, 31	2, 3, 8, 9, 13, 14, 17-19, 22-24, 29, 30	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30
Сланечнік, пшаніца, ячмень, жыта, авёс	27, 30, 31	1-5, 7-9, 12-14, 17-25, 27, 28	1-5, 8, 13-22, 24-28	1, 3, 5, 8-10, 13, 15-22, 24-30	1, 2, 5-7, 10-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 6-8, 15-26, 29, 30	4, 7-10 13-17, 19-23, 27, 28, 31	1-6, 10-19, 23, 24, 27-31	1, 2, 6-13, 15, 16, 19-21, 24-30	6-13, 16-22, 26, 27, 31	2, 3, 6-14, 17-19, 23, 24, 29, 30	1, 2, 5-11, 14-21, 29-31
Цыбуля на рэпку, часнок	27	2-5, 7-9, 20-24	1, 3-5, 8, 13-15, 19, 28	1, 3, 5, 8, 9, 13, 15-19, 27, 28	1, 2, 5,13, 15-17, 20, 24, 28, 29	2, 3, 6-8, 11-13, 16, 21-25, 29, 30	4-8, 13-15, 19-23, 26-28, 31	1-6, 10-12, 15, 17-19, 23, 24, 30, 31	1, 8-11, 13, 14, 18, 19, 24, 25, 29, 30	3, 7-9, 12, 13, 16, 17, 21, 22, 26, 27, 31	2, 3, 8, 9, 13, 14, 17-19, 22-24, 29, 30	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30
ДЭКАРАТЫЎНЫЯ ДРЭВЫ, КУСТЫ І КВЕТКІ												
Дэкаратыўныя ліяны, пакаёвыя ліяны	27, 30, 31	1-8, 24-29	12-14, 17-24	1, 2, 5-7, 23-30	12-17, 20-26	11-13, 16, 19-25	6, 7, 16, 17, 20-23, 25-27, 30, 31	1-5, 7-9, 12-14, 17-25, 27, 28	1-5, 8, 13-22, 24-28	6-13, 16-22, 31	2, 6-14, 17-19, 23, 29, 30	1, 2, 5-11, 14-21
Кветкі з насення	27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 7-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	3, 5, 8, 9, 13,15-22, 24-28	2, 5-7, 12-17, 19-22, 24-26, 28, 29	2, 3, 6-8, 15-26, 29, 30	3-9, 13, 16, 17, 20-23, 25-27, 30, 31	4, 7-9, 12-14, 17-25	3, 5, 8, 13-22, 24-28	7-13, 16 17, 21, 27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 5-11, 14-21, 29, 30
Кветкі цыбульныя, клубневыя, з карэння, у тым ліку пакаёвыя	27	2-5, 7-9, 20-24	1, 3-5, 8, 13-15, 19, 28	1, 3, 5, 8, 9, 13,15-19, 27, 28	1, 2, 5, 13, 15-17, 20, 24, 28, 29	2, 3,6-8, 11-13, 16, 21-25, 29, 30	5-9,16, 17, 21-23, 25-27	2-5, 7-9, 20-24	1,3-5,8, 13-15, 19, 28	7-9, 12, 16, 21, 22, 26, 27, 31	2, 3, 13, 14, 17-19, 22-24, 29, 30	2, 6, 7, 14-16, 20, 21, 27-30
Пікіроўка, перасадка кветак	27, 30, 31	2-5, 7-9, 20-24	1, 3-5, 8, 13-15, 19, 28	1,3,5,8,9, 13, 15-19, 27, 28	1, 2, 5, 13, 15-17, 20, 24, 28, 29	2, 3, 6-8, 11-13, 16, 21-25, 29, 30	5-9, 16, 17, 21-23, 25-27	2-5, 7-9, 20-24	1,3-5,8, 13-15, 19, 28	6-13, 16-22, 26, 27, 31	2, 3, 6-14, 17-19, 23, 24, 29, 30	1, 2, 5-11, 14-21, 29-31
Размнажэнне кветак чаранкамі	27, 30, 31	4, 12-14, 17-24	2-5, 8, 9, 12-14,17, 18, 23, 24	13-15, 18, 19, 26-28	5, 12-17, 20, 22, 24-26	1, 4-6, 9, 10, 14, 15, 17, 18, 26-28	4, 7, 13-17, 18, 19, 22, 23, 27, 28	3, 5, 6, 10-15, 17-19, 23, 25-29	1, 5, 6, 10,13-17, 25-28	6-13, 27, 31	2, 6-14, 17-19, 23, 24, 29, 30	1, 2, 5-11, 14-21, 29-31

ЗАБАРОНЕНЫЯ ДНІ ДЛЯ ПАСАДКІ, ПАСЕВУ І ПЕРАСАДЖВАННЯ РАСЛІН

Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
10, 11 ,21, 22, 26, 27	9-11,19-21, 25, 26	3, 4, 15-17,20-22, 30	3, 4, 8, 9, 30, 31	1, 4, 5, 14, 15, 27, 28	1-3, 10, 24, 25, 2, 30	7-9, 20, 21, 25 і 26, 4, 5, 7, 17,	22, 23	1, 2, 6, 14, 15, 28-30	5, 15, 16, 25, 26	3, 4, 12, 13, 22, 23

КАЛЯНДАР НА 2021 ГОД

ПРАВЯДЗЕННЕ РОЗНЫХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ

Віды работ	Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
Абганянне культывацыя, рыхленне,	5, 8, 10, 11,13,16, 18, 21 ,23, 26, 27	2, 3, 6, 7, 10, 15, 16, 20, 21, 25-28	3-6, 9-14, 16, 23-30	1-4, 8-11, 14, 18, 19, 27, 29-31	1, 4-6, 9, 10, 14-20, 23-28	1-3, 6-8, 11, 12, 18, 24, 25, 29, 30	1, 4, 7, 9, 16, 17, 20, 21, 25, 26, 30, 31	1, 4-6, 10,13-17, 22, 23, 25-28	3, 7, 10, 16, 20, 21, 25-27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 2, 5-11, 14-21
Абразанне дрэў і кустоў	8, 10, 11, 13, 16, 18, 21, 26, 27	1, 6, 7, 10, 11, 15, 16, 25-28	2, 4 6, 7, 10, 20-23 29, 30	1-4, 8-10, 18, 19, 29-31	1, 4, 5 9, 10, 14, 15, 17, 27, 28	1-3, 6-8, 25, 26, 29, 30	1, 2, 4, 7-9, 16, 17, 20, 21, 25, 26	14, 17, 18, 22-24, 26-28	3, 7, 10, 16, 20, 21, 25-27	2, 3, 8, 9, 13, 14, 17-19, 22-24, 29, 30	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30
Барацьба з хваробамі, знішчэнне шкоднікаў	5, 8, 10 11, 13, 16 18, 21 ,23, 26, 27	2, 3, 6, 7, 10, 15, 16, 20, 21, 25-28	3-6, 9-14, 16-23, 30	1-4, 8-11, 14, 18, 19, 27, 29-31	1, 4-6, 9, 10, 14-20, 23-28	1-3, 6-8, 11, 12, 18, 24, 25, 29, 30	1, 4, 7, 9 16, 17, 20, 21, 25, 26 30, 31	3-7, 13, 14,17,18, 22-24, 26-28	3, 7, 10, 16, 20,21, 25-27	2, 3, 8, 9, 13, 14, 17-19, 22-24, 29, 30	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30
Высадка, пікіроўка і перасадка расады	2-5, 7-9, 20-24	1,3-5,8, 13-15, 19, 28	1,3,5,8 9, 13, 15-19, 27, 28	1,3,5,13, 15-17, 20, 24, 28, 29	2, 3, 6-8, 11-13, 16, 21-25, 29, 30	4-8,13-15, 19-23, 26-28, 31	1-6,10-12, 15,17-19, 23, 24, 30, 31	1, 8-11, 13,14,18, 19,24,25, 29, 30	3, 7-9, 12, 13, 16, 17, 21, 22, 26, 27, 31	6-14, 17-19, 23, 24	1, 2, 5-11, 14-21
Інтэнсіўны паліў кустоў і дрэў	-	2-4, 6-9, 12-14, 16-25	1-14, 18, 19, 23-30	3, 4 8-11, 14, 18-21 23, 27-31	па меры высыхання глебы	па меры высыхання глебы	па меры высыхання глебы	1-3, 8-11 15,16,25, 29, 30	3, 7, 10, 16, 20, 21, 25-27	8, 22-24, 29	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30
Падкормка арганічнымі ўгнаеннямі	10-21	2-5, 8, 9, 27, 28	8-22	1, 2, 5-7, 28, 29	1, 2, 29-30	4, 9, 26-31	1-7, 23-31	1-6, 22-30	3, 7-9, 12, 13, 16, 17, 21, 22, 26, 27, 31	6-14, 17-19, 23, 24	1, 2, 5-11, 14-21
Падкормка мінеральнымі ўгнаеннямі	1-8, 24-29	12-14, 17-24	1, 2, 5-7, 23-30	12-17, 20-26	11-13,16, 19-25	13-23	10-20	8-20	3, 7-9, 12, 13, 16, 17, 21, 22, 26, 27, 31	6-14, 17-19, 23, 24	1, 2, 5-11, 14-21
Пасадка дрэў і кустоў	2-5, 7-9, 20-24	1, 3-5 , 8, 13-15, 19, 28	1, 3, 5, 8 9, 13, 15-19, 27, 28	1,2,5,13, 15-17, 20, 24, 28, 29	2, 3, 6-8, 11-13, 16, 21-25, 29, 30	4-8,13-15, 19-23, 26-28, 31	1-6,10-12, 15, 17-19, 23, 24 30, 31	1, 8-11, 13,14,18, 19, 24, 25, 29, 30	3, 7, 10, 16, 20, 21, 25-27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 2, 5-11, 14-21
Праполванне, прарэджванне ўсходаў	5, 8, 10, 11,13,16, 18, 21, 23, 26, 27	2, 3, 6, 7, 10, 15, 16, 20, 21, 25-28	3-6, 9-14, 16, 23-30	1-4, 8-11, 14, 18, 19, 27, 29-31	1, 4-6, 9, 10, 14-20, 23-28	1-3, 6-8, 11, 12, 18, 24, 25, 29, 30	1, 4, 7, 9, 16, 17, 20, 21, 25, 26, 30, 31	1, 4-6, 10, 13-17, 22, 23, 25-28	3, 7, 10, 16, 20, 21, 25-27	2, 3, 8, 9, 13, 14, 17-19, 22-24, 29, 30	1, 2, 5-11, 14-21
Прышчэпка	12-14,19, 20, 26-29	4, 12-14, 17, 19, 22-24	1, 3-5, 8, 9, 13, 14, 19, 25, 26, 28	2, 5-7, 12-17, 21, 22 24-26	1-4, 8-13, 14, 18, 19, 21-24, 27, 29-31	4-7, 13-15, 19-23, 26-28	3, 5, 6, 23, 24, 27-29	1, 5, 6, 10, 13-17, 22, 23, 25-28	3, 7, 10, 16, 20, 21, 25-27	6-14, 17-19, 23, 24	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30
Унясенне перагною	10-21	2-5, 8 9, 27, 28	8-22	1, 2, 5-7, 28, 29	1, 2, 29-30	4-9, 26-31	1-7, 23-31	1-6, 22-30	3, 7-9, 12, 13, 16, 17, 21, 22, 26, 27, 31	6-14, 17-19, 23, 24	1, 2, 6, 7, 10, 11, 14-16, 20, 21, 27-30

СКЛАДАЕМ ПЛАН ДЛЯ ГРАДАК

Мяркуючы па вопыце агароднікаў, пастаяннага месца ў расліны на градцы быць не павінна. Калі саджаць культуру з году ў год, не змяняючы яе месцазнаходжанне, — і з ураджаем паўстануць праблемы, і з глебай. Выправіць сітуацыю зможа рацыянальнае планаванне плошчы агарода.

КАПУСТА

Нельга высаджваць капусту і іншыя крыжакветныя (радыску, рэдзьку) на адным і тым жа месцы раней, чым праз два-тры гады. Белакачанную капусту лепш размяшчаць пасля бульбы, таматаў, цыбулі рэпчатай; дапушчальная пасадка пасля фасолі, гароху, морквы і буракоў.

БУЛЬБА

Найлепшыя папярэднікі для бульбы — капуста і розныя караняплоды. Дрэнны папярэднік для бульбы — тамат, бо гэтыя культуры маюць агульных шкоднікаў і ўзбуджальнікаў хвароб. Вырошчваць бульбу на адным і тым жа месцы варта не больш за тры гады.

АГУРКІ

Для агуркоў варта штогод шукаць новае месца. Лепш за ўсё яны растуць пасля цвятной і ранняй белакачаннай капусты. Таксама можна будзе іх садзіць пасля таматаў, бульбы, гароху і буракоў.

ПАМІДОРЫ

Нельга вырошчваць памідоры пасля бульбы, бо хваробы і шкоднікі ў гэтых культур адны і тыя ж. Добрыя папярэднікі для таматаў — цвятная і ранняя белакачанная капуста, гарбузовыя і бабовыя культуры, дапушчальныя караняплоды і рэпчатая цыбуля. Дарэчы, калі вы штогод саджаеце таматы на адным і тым жа месцы, глеба на гэтым участку становіцца кіслай. Таму кожнай восенню пад глыбокую перакопку глебы трэба ўносіць вапну-«пушонку» ў невялікіх колькасцях (ад 50 да 100 г на 1 кв. м), бо таматы лепш растуць на глебах з нейтральнай кіслотнасцю (pH 6,5-7).

БУРАКІ

Вырошчванне буракоў на адным месцы варта праводзіць не часцей, чым раз у тры-чатыры гады. Буракі добра растуць пасля агуркоў, кабачкоў, патысонаў, ранняй капусты, таматаў, ранняй бульбы, бабовых культур. Непажадана саджаць буракі пасля мангольду, шпінату.

ЦЫБУЛЯ

На адным месцы цыбулю нельга саджаць больш за тры-чатыры гады запар. Найлепшыя папярэднікі цыбулі — культуры, пад якія ўносілі вялікія дозы арганічных угнаенняў, а таксама агуркі, кабачкі і гарбузы, капуста, памідоры, бульба. На цяжкіх гліністых глебах цыбуля не дасць добрага ўраджаю, яна аддае перавагу лёгкім, рыхлым урадлівым глебам і любіць добрае асвятленне.

ЧАСНОК

Вырошчваць часнок на адным месцы можна не больш за два гады, інакш не пазбегнуць заражэння глебы сцябловай нематодай. Саджаць часнок лепш пасля агуркоў, ранняй бульбы, ранняй капусты і іншых культур, якія рана прыбіраюць (акрамя цыбулевых).

МОРКВА

Высейваюць пасля ранняй бульбы, капусты, зялёных культур (акрамя салаты), дапускаецца размяшчэнне пасля таматаў і гароху.

БАКЛАЖАНЫ

Найлепшымі папярэднікамі для баклажанаў з'яўляюцца агурок, цыбуля, ранняя капуста, шматгадовыя травы. Нельга саджаць баклажаны там, дзе ў мінулым годзе раслі бульба, таматы, фізаліс, а таксама перац і баклажаны.

СУНІЦЫ

Найлепшыя папярэднікі для суніц — радыска, салата, шпінат, кроп, гарох, фасоля, гарчыца, рэдзька, пятрушка, турнэпс, морква, цыбуля, часнок, сельдэрэй, а таксама кветкі (цюльпаны, нарцысы, аксаміткі). На беднай глебе найлепшыя папярэднікі суніцы — гарчыца, фацэлія. Непрыдатныя ў якасці папярэднікаў бульба, таматы і іншыя паслёнавыя, а таксама агуркі. Пасля іх участак можна занімаць суніцамі толькі праз тры-чатыры гады.

КЛУБНІЦЫ

Трускаўкі добра саджаць пасля радыскі, фасолі, гарчыцы, рэдзькі, гароху, пятрушкі, часнаку. Малапрыдатныя як папярэднікі бульба, таматы і агуркі. Нельга размяшчаць трускаўку пасля ўсіх відаў сямейства складанакветкавых (сланечнік, тапінамбур) і ўсіх відаў казяльцовых.

Акрамя таго, калі дазваляе плошча, вылучыце маленькі ўчастак для вырошчвання траў-сідэратаў: канюшыны, лубіну, люцэрны і іншых. Гэта дасць адпачынак зямлі, глеба набярэцца сіл для вырошчвання агароднінных культур.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Тимирязевский» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **одним лотом имущества в составе:**

- коровник *(составные части и принадлежности: 2 пристройки)* **с инв. № 642/С-39577, общ. пл. 1948,3 кв. м,**

- телятник с инв. № 642/С-39578, общ. пл. 1479,1 кв. м,

- здание коровника *(составные части и принадлежности: 5 пристроек)* **с инв. № 642/С-39575, общ. пл. 1411,1 кв. м,**

- здание зерносклада с инв. № 642/С-39574, общ. пл. 287,3 кв. м (далее – Объекты).

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 622881700001000027 площадью 12,2299 га (право аренды по 28.04.2040) по адресу: Минская область, Копыльский район, Бучатинский с/с, 8, 8/1, 8/2, 8/3, в районе д. Старина.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей (свыше 1000 вольт), пл. 1,1412 га; придорожная полоса автомобильной дороги, пл. 1,7921 га; мелиорируемые земли, пл. 3,7690 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 87 960,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 8 796,00** бел. руб.). Стоимость снижена на 50 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи, на депозитный счет Министерства юстиции Республики Беларусь. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 06.11.2020. Аукцион состоится **09.02.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.02.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320**. **Тел: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра: 8 (01719) 24-4-83; (033) 335-21-98.**

УНН 600018425.

ООО «Центр Белинвентаризация»
г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

Извещает о проведении аукциона по продаже имущества
ООО «Научно-производственное объединение «Пассат» 8 (029) 327 48 68

№ лота	Наименование объекта	Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	– капитальное строение (спальный корпус) с инв. №335/С-62297, площадью 2067,9 кв. м (составные части и принадлежности: подвал, вход в подвал, приямники, три крыльца, два склада, пожарный резервуар, насосная, склад с навесом, овощехранилище, два гаража, свинарник, уборная, теплица, забор, калитка, ворота, асфальтное покрытие), расположенное по адресу: Гомельская область, Петриковский р-н, г.п. Копаткевичи, ул. Школьная, 14/1; – капитальное строение (учебный корпус) с инв. № 335/С-62296, площадью 1766,1 кв. м. (составные части и принадлежности: подвал, приямники, три крыльца, дорожка, шесть заборов), расположенное по адресу: Гомельская область, Петриковский р-н, г.п. Копаткевичи, ул. Школьная, 14. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 324356000001000825 площадью 2,2123 га	**574 858,00**	**5 748,58**

Срок подачи заявления	**по 25 февраля 2021 г**. в рабочие дни с 09.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время и место проведения аукциона	**26 февраля 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф.2-1
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с BY71BPSB30121783390109330000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. **Получатель платежа:** ООО «Центр Белинвентаризация». **Назначение платежа:** задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете *«Звязда» от 27.01.2021 г.*
Условия продажи	объект продается в собственность. Цель использования – любая, кроме розничной торговли продовольственными товарами и общественного питания. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 15 (пятнадцати) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Стоимость лота, сформированная на аукционе, должна быть выплачена Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 30 (тридцати) рабочих дней с момента подписания договора купли-продажи. Победителю аукциона может быть предоставлена рассрочка оплаты стоимости до 24 (двадцати четырех) месяцев. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона

Для участия в аукционе необходимо предоставить

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либо лицо, признанное покупателем, оплачивает стоимость затрат на организацию и проведение аукционных торгов – Организатору аукционных торгов.
9. Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ООО «Центр Белинвентаризация»

Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении электронных торгов в форме открытого аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Бобруйский машиностроительный завод», 213805, г. Бобруйск, ул. К. Маркса, 235
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Алрес ЭТП: www.ipmtorgi.by
Предмет электронных торгов	
Здание кузнечно-сварочного, ремонтно-механического участка с энергоцехом, участком опытного производства, ацетиленовая станция, ТП-190 (здание нежилое), общ. пл. 5 583 кв. м, инв. № 710/С-5711, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Карла Маркса, 235. **Составные части и принадлежности**: две пристройки, крыльцо. **Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения, общ. пл. 6,0672 га	
Начальная цена (с НДС 20 %) – 609 600,00 бел. руб. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона	
Условия оплаты предмета электронных торгов	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи	
Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену	
Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **3 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона	
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия	
Дата и время начала и окончания электронных торгов	
Начало торгов: **11.00 01.03.2021**. Окончание торгов: **13.00 01.03.2021**. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Дата и время окончания приема заявок	
Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 25.02.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by	
Контактные данные	**+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Утерянное свидетельство о государственной регистрации ООО «НАЛМ ВЕБ» (УНП: 191759076) считается недействительным.

Страховые полисы «Универсальные серии» ПЕ № 0576283, ПЕ 0485336, ПЕ 0519536, ПЕ 0541101 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» считать недействительными в связи с утерей.

УНП 100357923

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Продавец	ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. +375 44 743 00 30) – производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 470- 18Б/2017
Предмет аукциона	
Предприятие как имущественный комплекс ОАО «МОТОВЕЛО» (регистрационный номер 0001427, свидетельство № 3420 от 4 января 2019 г.). Состав имущества и имущественных прав см. на сайте ipmtorgi.by	
Месторасположение производственной базы – **Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, 39, район д. Лесины**	
Начальная стоимость без НДС – 46 681,10 бел. руб. (снижена на 50 %) Шаг аукциона без НДС – 2 334,06 бел. руб.	
Порядок ознакомления	Ознакомление заинтересованных лиц с предметом аукциона осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Чарный Дмитрий Николаевич, тел. +375 44 743 00 30
Задаток 3 % от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях перечисляется на Р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»	
Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Порядок оформления участия в аукционе: лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в срок до 17.00 **15.02.2021** заявление на участие в аукционе с приложением документов согласно ст. 127 вышеуказанного Закона. Критерии выявления победителя аукциона: имущество считается проданным лицу, которое предложило на аукционе самую высокую цену. Порядок оформления результатов торгов: победитель торгов (претендент на покупку) в день проведения торгов подписывает протокол	
Срок подписания договора купли-продажи	**15** (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона
Условия оплаты предмета аукциона	
Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов	
Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить продавцу и организатору торгов затраты на их проведение и оплатить организатору торгов установленное вознаграждение в размере 3 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте ipmtorgi.by	
Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 15.05.2020, 18.07.2020, 15.10.2020, 27.11.2020, 24.12.2020; в журнале «Судебный вестник Плюс: экономическое правосудие» за 2020 год: № 7 – с. 59–60, № 9 – с. 57–58, № 10 – с. 52–53; № 11 – с. 60, № 12 – с. – 60.	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Аукцион состоится 16.02.2021 в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. **Заявления на участие и необходимые документы, в т. ч. перечисление задатка, принимаются с 9.00 27.01.2021 по 15.02.2021 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; +375 (44) 704-92-06, ipmtorgi.by**. E-mail: auction@cpo.by**	

ОАО «Житковичлес» сообщает о нахождении с 9 ноября 2020 г. в процессе ликвидации на основании решения общего собрания акционеров, принятого 30.10.2020 г. (протокол № 49). Депозитарий: закрытое акционерное общество «Западное фондовое бюро», 246050, г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-403, УНП 200422609. Ликвидатор А. Н. Лобко

УНП 400049968

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Житковичлес»** (УНП 400049968), 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, в лице ликвидатора Лобко Александра Николаевича, тел. 8 (02353) 2-18-74.

Публичные торги в электронной форме будут проведены: **1 марта 2021 г**. **с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY**.

№	Предмет торгов, местонахождение	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Имущественный комплекс (автозаправочная станция), включающий в себя: - здание заправки, инв. № 332/С-104305; - бывший в эксплуатации железнодорожный подъезной путь не общего пользования (путь № 2) длинной 425 м; - цистерна 25 м³ – 4 шт.; - цистерна 75 м³ – 2 шт.; - емкость металлическая 75 м³; - бензоколонка типа А-50 – 2 шт.; - КТП-451 (трансформатор 250 кВт); - гидрант пожарный подземный Н = 1000 мм, гост 8220-85; - подъездной путь к нижнему складу Житковичи, по адресу: Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Железнодорожная, 16А	313 200,00
2	Щепа топливная хвойных пород 1000 куб. м, Гомельская обл., Житковичский р-н, п. Хвоенск	14 400,00
3	Дрова топливные хвойных пород, длиной от 2 до 4 м, диаметром от 3 см, 1000 куб. м	16 800,00
4	Дрова топливные хвойных пород, длиной от 2 до 4 м, диаметром от 3 см, 1000 куб. м	16 800,00
5	Дрова топливные хвойных пород, длиной от 2 до 4 м, диаметром от 3 см, 1000 куб. м	16 800,00
6	Дрова топливные хвойных пород, длиной от 2 до 4 м, диаметром от 3 см, 1000 куб. м	16 800,00
7	Дрова топливные хвойных пород, длиной от 2 до 4 м, диаметром от 3 см, 1000 куб. м	16 800,00
8	Дрова топливные хвойных пород, длиной от 2 до 4 м, диаметром от 3 см, 1000 куб. м	16 800,00
Местонахождение: 1 – Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Комсомольская, 45а,		

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 28.01.2021 г. с 09.00 по 26.02.2021 г. до 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Информация о формировании реестра акционеров

ОАО «Амкодор-КЭЗ», Витебская обл., Толочинский район, г. п. Коханово, Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, на основании решения Совета директоров общества от 26 января 2021 года для проведения внеочередного общего собрания акционеров определило дату формирования реестра акционеров – 26 января 2021 года.

УНП 300028841.

Апошнія сведкі

«У ТОЙ ДЗЕНЬ З НАШАЙ ВЁСКІ ЎРАТАВАЛАСЯ ДЗЕВЯЦЬ ЧАЛАВЕК»

Падчас апошняй (дай бог) вайны гітлераўцы спалілі і разбурылі 209 беларускіх гарадоў, знішчылі больш за дзевяць тысяч населеных пунктаў, у тым ліку — 628 разам з людзьмі. Сярод такіх паселішчаў і вёска Ельна былога Ленінскага раёна Палескай вобласці, знішчаная зімой 1943-га. Даўным-даўно, як здавалася б, 78 гадоў прайшло, аднак (як паведаміў мне случчанін Фёдар Аляксандравіч Гатчэня) у вёсцы Палосцевічы, дзякаваць богу, жыве яшчэ сведка тых страшных падзей.

Ганна Міхайлаўна Таболіч нарадзілася 92 гады таму, пры панскай Польшчы, у сям'і, дзе было дзявяцёра дзяцей, праўда, трое з іх памерлі малымі... Расказвае, што вучылася ў польскай школе, што добра помніць верасень 1939-га, прыход Чырвонай арміі і, вядома ж, пачатак вайны.

— Дарогі былі не тое, што цяпер, — гаворыць Ганна Міхайлаўна. — Тады — летам і зімой да Ельна яшчэ можна было дабрацца, а вясной і восенню амаль немагчыма. Вёска была партызанскай. Шмат нашых хлопцаў і маладых мужчын падаліся ў атрады, і — калі разведчыкі, калі падрыўнікі з атрада Камарова (гэта падпольная клічка Васіля Каржа) — часта завітвалі да жыхароў, праз Ельна хадзілі на чыгунку Лунінец — Жыткавічы — Гомель...

Аб гэтым, напэўна ж, ведалі немцы, таму над намі ўсё больш навісалі хмары, вёску разам з людзьмі хацелі спаліць. Першы раз гэта не ўдалося, жыхары паспелі ўцячы ў лес. Другі — немцы з паліцаямі прыйшлі з боку хутара Моршчына, спалілі яго, хутаран забралі з сабой. Адну жанчыну, якая ўцякала ў бок Ельна, дагналі і застрэлілі.

Пачуўшы гэтую стральбу, нашы людзі, што заставаліся ў вёсцы (бо многія перабраліся на хутар Вялікая Ніва, а на свае падворкі прыходзілі толькі даглядаць гаспадарку), зноў схаваліся ў лесе...

А яшчэ да гэтага Міхаіла Касцюкевіча, што ў нас быў абраны старастам, выклікалі ў раён да каменданта і загадалі, каб людзі заставаліся ў вёсцы. Сказалі, што ім нічога не пагражае, што нямецкія ўлады хочуць проста сабраць падаткі і ўсё.

Праз дзень, — працягвае Ганна Міхайлаўна, — у нашай вёсцы з'явілася група з сямі партызан, узброеных вінтоўкамі, аўтаматамі і кулямётам. У Ельне яны пражылі з тыдзень. А неяк студзеньскім ранкам карнікі (нямецкія салдаты і старобінская паліцыя) мінулі нашу вясковую варту, якая знаходзілася на Тарасавым хутары, і ўвайшлі ў Ельна. Партызаны ў іх бок зрабілі два выстралы, а далей...

У хату, помню, забягае тата, крычыць, каб я хутчэй апраналася-абувалася. Не расказаць, каласок, — працягвае Ганна Міхайлаўна, — як мы з татам уцякалі ад немцаў, як беглі праз свой агарод да лесу! Снегу шмат было, гурбаны вялікія. Я спатыкалася, падала, згубіла свой абутак, але зноў падымалася і бегла па снезе, бо ззаду па нас з татам стралялі паліцаі, яны, здавалася, ужо даганяюць... Але ж мы дабеглі-такі да лесу, паспелі схавацца.

Каб я не памарозіла ногі, тата ў час перадыху адарваў рукавы ад свайго кажуха, надзеў мне на ногі замест згубленых лапцей і падвязаў аборкамі...

Мы потым даведаліся, што з вёскі ў той дзень уратавалася толькі дзевяць чалавек. Астатніх жыхароў — старых, маладых, дзяцей — сагналі ў вялікі дом Антона Бахановіча і спалілі жывымі. Тых, хто ўцякаў, застрэлілі, а перад гэтым вёску абрабавалі — пазабіралі жывёлу, лепшыя рэчы...

Мы з бацькам дабраліся да хутара Вялікая Ніва. Там да вайны чатыры хаты стаяла і там нас сустрэла мама з маёй сястрой Кацяй і братам Іванам.

Пасля Перамогі наша спаленая вёска адрадзілася. Тата працаваў майстрам у лясгасе, пабудаваў невялікую хаціну, дзе мы і жылі. Я выйшла замуж, нарадзіла трох сыноў, Васіля, Мікалая і Вячаслава, ёсць тры ўнукі і адзін праўнук. Вось так і жыву.

...Аповед Ганны Міхайлаўны, апошняй з жывых сведак, варта дапоўніць успамінамі яшчэ аднаго жыхара Ельна Аляксея Іванавіча Драгуна (кніга «Памяць. Жыткавіцкі раён»). Былы партызан атрада імя Панамарэнкі расказвае, што немцы каля іх вёскі з'явіліся студзеньскім марозным днём з боку дарогі, што вяла ў Мікашэвічы. Што нехта з партызанаў-разведчыкаў, якія ў той час знаходзіліся ў Ельне, сапраўды стрэліў у бок карнікаў, пасля чаго група партызанаў адышла ў лес, а немцы сталі зганяць людзей у адзін вялікі дом. Каля дзвярэй яго паставілі кулямёт, і ўсіх, хто імкнуўся ўцячы, расстрэльвалі на месцы. Тых, хто выскокваў праз акно, забівалі прыкладамі ці стралялі з вінтовак. Потым хату падпалілі... Падчас карнай аперацыі 1943 года не стала 112 чалавек.

...І яшчэ некалькі лічбаў: да вайны ў Ельне была 41 хата, пражываў 151 жыхар. На 1 студзеня 2021 года там, паводле даных сельвыканкама, 11 дамоў і 15 жыхароў.

Васіль Цішкевіч,
навуковы супрацоўнік
раённага краязнаўчага музея,
г. Слуцк.

Землякі

«ЯГО ШМАТ ХТО ЛІЧЫЎ ДЗІВАКОМ»

У нашай Малькавіцкай бібліятэцы-музеі працуе экспазіцыя памяці ўраджэнца вёскі Івана Пятровіча Лагвіновіча, трэнера, які падрыхтаваў больш за 30 майстроў спорту па цяжкай атлетыцы, у тым ліку і алімпійскага чэмпіёна.

Неяк мне пашчасціла пабываць у хаце, дзе нарадзіўся Іван Пятровіч, дзе планаваў стварыць музей роду Лагвіновічаў. На жаль, не ўсё ён паспеў зрабіць, але...

У сваіх бацькоў ён быў адным з 11 дзяцей. Не дзіва, што сям'я жыла вельмі бедна. Але ж бацькі — Пятро Майсеевіч і Ганна Міхайлаўна — адправілі 16-гадовага Івана вучыцца.

У Жыровіцкім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі ён усур'ёз захапіўся цяжкай атлетыкай і, як сам казаў, дасягнуў бы поспехаў, калі б...

На харчаванне бацькі маглі выдзеліць яму ўсяго 10 рублёў у месяц. На гэтыя грошы цяжка было пражыць нават не штурхаючы штангу. Як вынік — хворае сэрца.

Аднак развітвацца са спортам Іван не хацеў: вырашыў, што будзе трэнерам. І ўжо студэнтам інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі, не маючы спецыяльнай адукацыі, стаў вучыць, трэніраваць іншых.

Тады на спаборніцтвах ён і заўважыў Леаніда Тараненку. Дзякуючы гэтай лёсавызначальнай сустрэчы настаўнік стаў заслужаным трэнерам БССР, а затым і СССР, а Леанід — алімпійскім чэмпіёнам, сусветны рэкорд якога (266 кг у штуршку) ніхто не паўтарыў да сёння.

Іван Лагвіновіч лічыў, што лёс «падарыў» яму Тараненку. Леанід жа сцвярджаў, што ўсё наадварот, што Іван Пятровіч — унікальны чалавек і спецыяліст у цяжкай атлетыцы (хоць наогул ён — інжынер-механік, кандыдат тэхнічных навук, толькі на шостым дзясятку паступіў у Мінскі інстытут фізічнай культуры).

...Яго многія лічылі дзіваком, а ён марыў і тварыў — не толькі ў спорце. Адпрацаваўшы амаль 50 гадоў у Навукова-даследчым інстытуце механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, ён распрацаваў і ўкараніў у вытворчасць 34 найменні абсталявання, атрымаў 12 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы.

...Вось такі чалавек нарадзіўся ў невялічкай палескай вёсачцы, дзе Івана Лагвіновіча памятаюць і будуць помніць заўсёды. Доказам таму — экспазіцыя ў бібліятэцы-музеі са шматлікімі фотаздымкамі і дакументальнымі матэрыяламі.

Таццяна Маляўка,
Ганцавіцкі раён.

Весткі з месцаў

Прафесіяналамі не нараджаюцца, імі становяцца

У Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы стала традыцыяй праводзіць урачыстыя пасвячэнні ў прафесію.

Падчас іх маладых спецыялістаў, якія нядаўна прыступілі да работы і паспелі сябе паказаць, вітаюць прадстаўнікі адміністрацыі і прафсаюзнага камітэта, уручаюць падарункі і кветкі. Тады ж адбываецца паказ тэатральнай пастаноўкі. Сёлета, напрыклад, самадзейныя артысты з ліку супрацоўнікаў бальніцы паказалі спектакль «Карнавальная ноч»,

у якім бліскуча дэбютавала моладзь.

Не так даўно шэрагі работнікаў установы папоўнілі чацвёра ўрачоў і 17 медыцынскіх сясцёр. Усе яны сышліся на думцы, што ім падабаецца і работа, і калектыў. Іх тут сапраўды душэўна сустрэлі, а старэйшыя і больш вопытныя калегі заўжды гатовыя падтрымаць, і калі спатрэбіцца, дапамагчы.

Таццяна Малініна,
фота аўтара.

Дзякуй!

Калі побач сапраўдны доктар...

Не адважуся пісаць па-беларуску, бо, на жаль, дрэнна ведаю мову, хоць «Звязду» выпісваю вельмі даўно. З задавальненнем чытаю артыкулы Алены Ляўковіч, Святланы Яскевіч ды іншых, рада, што ў краіне ёсць газета вельмі блізкая да людзей.

Неяк у ёй друкаваўся артыкул пра суседнюю, Доўскую бальніцу, таму зараз я хацела б расказаць пра сваю, Гарадзецкую, пра нашага доктара Ірыну Уладзіміраўну Місачэнку.

Яна сапраўдны прафесіянал і лекар ад Бога — прычым, вельмі ўважлівы, добразычлівы і пазітыўны. Умее выслухаць і падбадзёрыць, умее пераканаць чалавека, што ён абавязкова паправіцца...

Усё гэта мы з мужам ведаем не па чутках, бо не так даўно захварэлі на ковід. Ірына Уладзіміраўна адразу прыехала да нас дадому, узяла мазкі, напісала, якія лекі і як прымаць. Потым яшчэ не раз тэлефанавала, пыталася, як сябе адчуваем, двойчы на тыдзень заязджала, мерала ціск, слухала, ці няма хрыпу ў лёгкіх...

Пасля адной з такіх праверак мне давялося зрабіць рэнтген — лячыць правабаковую пнеўманію.

І зноў побач са мной была доктар: прызначыла лекі, сачыла за тым, як я іду на папраўку.

...Ведаю, што Ірына Уладзіміраўна лячыла і вылечыла не толькі нас з мужам, але і многіх іншых аднавяскоўцаў. А таму праз газету хачу падзякаваць ёй і ўсяму калектыву нашай бальніцы за працу, за ўвагу да нас, пацыентаў, пажадаць у гэты вельмі няпросты час моцнага здароўя і сіл.

М. С. Краўцова,
в. Высокае, Рагачоўскі раён.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

ЕЛКУ МОЖНА СЕКЧЫ, АЛЕ НЕЛЬГА СПАЛЬВАЦЬ У ПЕЧЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Хоць гэта эканамічна немэтазгодна, мы ўсведамляем нашу сацыяльную адказнасць, бо з пункта гледжання экалогіі яны наносяць вялікі ўрон наваколлю і, да таго ж, павялічваюць аб'ёмы назапашанага смецця на палігонах, — падзяліўся **Аляксандр ЛАГУЦЁНАК, начальнік аддзела продажаў і маркетынгу групы кампаній REMONDIS.** — А шляхам перапрацоўкі мы ператвараем небяспечнае дрэва ў карысны кампост. З адной тоны адходаў елак атрымліваецца 500—600 кілаграмаў кампосту, які далей выкарыстоўваецца на палях як гаспадарчае ўгнаенне.

Спецыялісты просяць ачышчаць елкі ад мішуры і ўпрыгожванняў, бо гэта, як правіла, пластык, які не перапрацоўваецца. А яшчэ, выкідаючы елку на сметнік, не трэба абгортваць яе цэлафанам ці абмотваць скотчам, бо ўсё гэта супрацоўнікам прыходзіцца здымаць, а значыць, марнаваць час. Усе пункты, куды можна занесці елкі, і дні, калі іх будуць

Генадзь ЛАЎРЭНЧЫК, начальнік участка па перапрацоўцы адходаў каля бурта з гатовым кампостам. Угнаеннне, карыснае для глебы, здаецца нібыта тлустым.

забіраць, пазначаны на сайтах адміністрацый горада. Гэта зроблена спецыяльна, каб дрэвы не ляжалі на кантэйнерных пляцоўках доўга. У трох раёнах сталіцы, якія абслугоўвае REMONDIS, вызначана каля 1000 пунктаў збору, куды можна прынесці навагодніх прыгажунь.

АДХОДЫ З ПРЫРОДЫ

Каб ссечаная елка стала кампостам, трэба прыкладна паўгода. «Гатуецца» яна на ўчастку па перапрацоўцы раслінных адходаў: травы, лістоты, драўніны, рэшткаў агародніны.

Пачынаецца працэс перапрацоўкі ўсіх арганічных адходаў з іх драбнення. Падыходзячыя па памеры драўняныя адходы драбняцца для нарыхтоўкі паліўных шчэпак, якія пасля стануць палівам для кацельных. Маленькія галінкі, трава, лісце і елкі крышацца як сыравіна для кампосту. Абрэзкі сукоў дрэў (гэтым цяпер займаецца Мінскзеленбуд) таксама прыязджаюць сюды, каб стаць арганічным кампостам. Штогод тут рыхтуюць яго чатырышэсць тысяч тон. Пасля ён становіцца карысным угнаеннем для кветнікаў, газонаў і сельскагаспадарчых палёў.

Машына для драбнення па памерах нагадвае звычайную дызель-генератарную. Экскаватарам у яе закідваюцца елкі, якія драбняцца ўнутры, а атрыманыя кавалачкі па транспарцёрнай стужцы высыпаюцца ў кучу.

— Пасля драбнення атрыманая маса закладваецца ў бурты, дзе на працягу трохпяці месяцаў адбываецца працэс кампасціравання. Гэта дасягаецца аэробным шляхам (з дапамогай кіслароду і высокай тэмпературы, што ствараецца ўнутры бурта). Дзесьці праз месяц ці паўтара робім аэрацыю — адсейваем крайні бурт на сіце. Вялікія кавалкі зноў адпраўляюцца на драбненне, а маленькія — у новы бурт як гатовы кампост, — апісаў тэхналогію **Генадзь ЛАЎРЭНЧЫК, начальнік участка па перапрацоўцы адходаў.**

Простымі словамі гэта значыць, што экскаватар перацягвае сыравіну з бурта на сіта — спецыяльную машыну, дзе кавалкі прасейваюцца ў барабане і ў залежнасці ад памера выязджаюць па пэўнай транспарцёрнай стужцы на дапрацоўку ці адпраўляюцца ў чарговы бурт кампосту.

— Тэмпература ўнутры бурта, пакуль «саспявае» кампост, ад 60 да 80 °С. Кампост уносіцца ў глебу і павышае яе ўрадлівасць, — дадаў ён. — Гэта гатовае арганічнае рэчыва, якое перапрэла і перагніло, а не звычайны гной, які часта прывозяць на палі проста з фермаў без папярэдняй падрыхтоўкі.

Калі экскаватар зачэрпвае з бурта сыравіну, адтуль на марозным паветры валіць пара і па ўчастку сцелецца туман, пацвярджаючы, што ўнутры сапраўдная спёка.

Гатовы кампост могуць набыць не толькі сельгаспрадпрыемствы ці садовыя таварыствы, а і проста грамадзяне, калі ім патрэбна, скажам, кілаграмаў 30 арганічных угнаенняў, каб дадаць іх у глебу для вырошчвання расады. Выкарыстоўваць для гэтага чысты кампост спецыялісты не рэкамендуюць — занадта канцэнтраваны. Каштуе кампост 10 рублёў (без ПДВ) за тону.

ПУЛЬВЕРЫЗАТАР ДЛЯ СМЕЦЦЯ

Ёсць на ўчастку таксама і зона перапрацоўкі мінеральных адходаў — буйнапамернага будаўнічага смецця. З яго робяць другасны друз. А яшчэ адсюль на ўчастку выбіраюцца другасныя матэрыяльныя рэсурсы (ДМР): поліэтылен, папера, шкло, метал, арматура, драўніна.

— Паколькі будаўнічыя адходы ў прынцыпе ніхто

не сартуе, усё пасля рамонту аб'ектаў, будаўніцтва ці зносу будынкаў трапляе да нас кучай з будаўнічых кантэйнераў, — тлумачыць Генадзь Лаўрэнчык. — Такое смецце трэба раздзяляць, перш чым перапрацоўваць.

Машына для драбнення бетонных адходаў на меншыя фракцыі выглядае як экскаватар, у якога замест каўша спецыяльнае абсталяванне, што нагадвае вялізныя пласкагубцы. І называецца такая незвычайная тэхніка пульверызатар.

Атрыманыя такім чынам кавалкі з дапамогай драбільнага каўша ператвараюцца ўжо ў гатовы друз. Гэтую прадукцыю таксама прасейваюць на сіце, каб адсартаваць шчэбень на буйнапамерны ці мінеральную сумесь. Апошняя падыходзіць для ўкладкі пліткі, стварэння верхняга слоя дарогі, падсыпання сцежак, кажуць спецыялісты.

Увогуле, мэта перапрацоўкі ўсіх адходаў у краіне — зменшыць колькасць палігонаў, каб смецце не складзіравалася, а поўнасцю ўцягвалася ў абарачэнне і выкарыстоўвалася далей. Гэта, як ужо вядома і відавочна, на карысць усім.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.
Больш фота глядзіце на сайце «Звязды».

Калі разварушыць бурт, відавочна бачная высокая тэмпература ў ім.

Актуальна

АДНАЎЛЕННЕ ПАСЛЯ КРЫЗІСУ НА РЫНКУ ПРАЦЫ

можа быць няўстойлівае і нераўнамернае

Да такой высновы прыходзіць Міжнародная арганізацыя працы (МАП), аналізуючы наступствы COVID-19 для рынку працы. Аналітыкі МАП прызнаюць, што пандэмія прывяла да велізарных страт рабочага часу і даходаў, а аднаўленне на працягу 2021 года будзе павольнае, нераўнамернае і няўстойлівае, калі першыя зрухі да лепшага не падмацаваць мерамі, накіраванымі на аднаўленне эканомікі з упорам на інтарэсы людзей.

У ЧАТЫРЫ РАЗЫ ГОРШ, ЧЫМ КРЫЗІС 2009 ГОДА

Пасля ўзрушэнняў 2020-га, звязаных з COVID-19, на сусветных рынках працы назіраюцца прыкметы нясмелага ажыўлення, гаворыцца ў новым даследаванні арганізацыі.

Паводле апошніх даных, страты рабочага часу ў свеце за ўвесь мінулы год склалі 8,8 % (у параўнанні з чацвёртым кварталам 2019 года), што эквівалентна 255 мільёнам рабочых месцаў на ўмовах поўнай занятасці. Гэта прыблізна ў чатыры разы больш, чым падчас сусветнага фінансавага крызісу 2009 года.

Такія страты тлумачацца альбо пераводам работнікаў на скарочаны рабочы час, альбо «беспрэцэдэнтнымі» маштабамі скарачэння колькасці рабочых месцаў, ад якіх пацярпела 114 мільёнаў чалавек. Характэрна, што 71 % агульнага аб'ёму скарачэння занятасці (81 мільён чалавек) выяўляецца не ў беспрацоўі, а ў бяздзейнасці. Гэта значыць — людзі пакідалі рынак працы, паколькі не мелі магчымасці працаваць. Таму калі браць у разлік толькі беспрацоўе, гэта прывядзе да істотнай недаацэнкі ўздзеяння COVID-19 на рынак працы. Гэтыя маштабныя страты прывялі да зніжэння на 8,3 % сусветных працоўных даходаў: гэта 3,7 трыльёна долараў ЗША, або 4,4 % агульнасусветнага валавога ўнутранага прадукту (ВУП).

МЫ МОЖАМ СТРАЦІЦЬ ПАКАЛЕННЕ

Як аказалася, на жанчынах выкліканыя пандэміяй узрушэнні на рынку працы адбіліся мацней, чым на мужчынах. У агульнасусветным маштабе скарачэнне занятасці сярод жанчын складае 5 %, а сярод мужчын — 3,9 %. Жанчыны, у прыватнасці, значна часцей за мужчын пакідаюць рынак працы і спыняюць працоўную дзейнасць.

Іншая асабліва пацярпелая катэгорыя — маладыя работнікі, якія альбо страчваюць работу, альбо адсейваюцца са складу працоўных рэсурсаў, альбо адкладваюць пачатак працоўнага жыцця. Скарачэнне занятасці сярод моладзі (ва ўзросце 15—24 гадоў) склала 8,7 %, у той час як сярод дарослага насельніцтва — 3,7 %. Гэта кажа пра «больш чым рэальную рызыку атрымаць «страчанае пакаленне», падкрэсліваюць эксперты.

Даследаванне паказала, наколькі па-рознаму выяўляюцца наступствы пандэміі па галінах, рэгіёнах і сегментах рынку працы. У ім паўстае ўстрывожанасць у сувязі з тым, што паслякрызіснае аднаўленне можа пайсці нераўнамерна, і калі не будуць прыняты карэкцыйныя меры, найбольш пацярпелыя галіны і работнікі апынуцца кінутымі на волю лёсу, што прывядзе да росту няроўнасці.

Найбольш пацярпелымі галінамі названы **гасцінічная гаспадарка і грамадскае харчаванне,** дзе занятасць у сярэднім скарацілася на 20 %. Далей ідуць дробны гандаль і апрацоўчая прамысловасць, а ў такіх галінах, як інфармацыя і камунікацыі, фінансавая і страхавая справа, у другім і трэцім кварталах 2020 года назіраўся рост занятасці. Нязначны рост адзначаны таксама ў горназдабыўной прамысловасці і сферы камунальных паслуг.

ШТО ДАЛЕЙ?

Сітуацыя па-ранейшаму характарызуецца высокай ступенню нявызначанасці, аднак, па апошніх прагнозах, у другой палове 2021 года, калі прынясуць вынік праграмы вакцынацыі, у большасці краін пачнецца адносна актыўнае аднаўленне.

Існуюць тры сцэнарыі аднаўлення: асноўны, песімістычны і аптымістычны. Пры асноўным сцэнарыі, у 2021 годзе агульна-сусветныя страты рабочага часу ў параўнанні з 4-м кварталам 2019 года складуць 3 %, што эквівалентна 90 мільёнам рабочых месцаў на ўмовах поўнай занятасці.

Згодна з песімістычным сцэнарыем, які прадугледжвае, у прыватнасці, нізкія тэмпы вакцынацыі насельніцтва, страты рабочага часу дасягнуць 4,6 %, а па аптымістычным сцэнарыі — 1,3 %. Залежаць гэта будзе ад таго, наколькі ўдасца ўзяць пандэмію пад кантроль і наколькі ўпэўнена стануць адчуваць сябе спажыўцы і дзелавыя колы.

Па ўсіх сцэнарыях мяркуецца, што страты рабочага часу на Амерыканскім кантыненце, у Еўропе і Цэнтральнай Азіі прыкладна ўдвая перавысяць аналагічны паказчык для іншых рэгіёнаў. Міжнародныя эксперты падрыхтавалі шэраг стратэгічных рэкамендацый, якія датычацца паслякрызіснага аднаўлення. У іх ліку захаванне на працягу 2021 года і ў далейшым ліберальнай макраэканамічнай палітыкі, уключаючы, наколькі магчыма, падаткова-бюджэтнае стымуляванне і меры, накіраваныя на падтрыманне ўзроўню даходаў і садзейнічанне інвестыцыям; мэтавыя меры ў інтарэсах жанчын, моладзі, некваліфікаваных і нізкааплатных работнікаў — найбольш пацярпелых катэгорый; міжнародная дапамога краінам з нізкім і сярэднім узроўнямі даходаў, якія не валодаюць дастатковымі фінансавымі рэсурсамі для шырокай вакцынацыі насельніцтва і забеспячэння аднаўлення эканомікі і занятасці, і іншыя.

«Прыкметы аднаўлення, якія мы назіраем, абнадзейваюць. Але не будзем забываць, што ні адна краіна ці група краін не зможа справіцца з аднаўленнем у адзіночку», — заявіў генеральны дырэктар МАП Гай Райдэр.

Сяргей КУРКАЧ.

УНІКАЛЬНЫ МУЗЕЙ

Падчас урачыстага адкрыцця музейнай экспазіцыі ў Пятым форце Брэсцкай крэпасці неаднойчы з удзячнасцю згадвалі спецыяльны праект Саюзнай дзяржавы, дзякуючы рэалізацыі якога і з'явіўся яшчэ адзін унікальны музей. Дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Рыгор БЫСЮК нагадаў, што за тры гады работы па праграме капітальна адрамантаваны дзевяць аб'ектаў, адкрыты тры музейныя экспазіцыі.

ВЯЛІКАЯ РАБОТА

Мемарыяльны комплекс складаецца з мноства збудаванняў. Узрост большасці з іх перавышае сто гадоў. Вядома, пастаянна трэба ўкладваць сродкі і прыкладаць намаганні для падтрымання іх у належным стане. У межах праграмы праведзена вялікая работа. Асобныя ўчасткі патрабавалі тэрміновай кансервацыі — і гэта было зроблена. Таксама заменена 12 тысяч квадратных метраў даху паўднёвай і паўднёва-заходняй казарм. Абноўлена дэкаратыўна-мастацкая падсветка, капітальна адрамантаваны мост праз раку Мухавец.

У 2019 годзе была адкрытая новая гістарычная экспазіцыя пад назвай «Летапіс Брэсцкай крэпасці». Яна створана ў паўднёва-ўсходняй казарме цытадэлі мемарыяла і раскрывае факты, падзеі, апавядае пра лёсы людзей, звязаныя са 180-гадовай гісторыяй крэпасці. Аснова экспазіцыі — трохмерныя панарамы з шырокафарматнымі пейзажамі, кругавы агляд, аўтэнтычныя аконныя праёмы, байніцы, гістарычныя фігуры ў натуральную велічыню, сцэны з жыцця крэпасці, прадметы побыту. Экспазіцыя складаецца з сямі залаў. Аналагаў ёй няма ў Беларусі.

Летась у канцы чэрвеня была адкрытая экспазіцыя, прысвечаная абароне Усходняга форта. Гэта асаблівая старонка ў гісторыі абароны крэпасці. Рубеж стаў апошняй апорай яе абаронцаў. Пасля нападзення на крэпасць тут знайшло ўкрыццё каля 400 чалавек. Іх размеркаваў у тры роты і ўзначаліў легендарны маёр Гаўрылаў. Шматлікія матэрыялы экспазіцыі расказваюць, як развіваліся падзеі далей... Маршрут экскурсіі праходзіць не толькі ўнутры форта па музейных пакоях, але і звонку. Значная частка музея прысвечана лёсу абаронцаў форта. За паўгода, нягледзячы на пандэмію, там пабывала каля шасці тысяч чалавек.

Словам, каманда архітэктараў, гісторыкаў, мастакоў, будаўнікоў правяла вялікую работу ў крэпасці. А нядаўна расчыніў дзверы для наведвальнікаў яшчэ адзін музей — «Пяты форт Брэсцкай крэпасці».

ТАЎШЧЫНА СЦЕН — ТРЫ МЕТРЫ

«Варта сказаць, што форт № 5 Брэст-Літоўскай крэпасці захаваўся найлепш з усіх такіх аб'ектаў. Ён знаходзіцца прыкладна за тры з паловай кіламетры ад цэнтра мемарыяльнага комплексу на адной з ускраін горада. Гэта першы фартыфікацыйны аб'ект у Берарусі, які быў музеефікаваны», — адзначыў **загадчык філіяла мемарыяла Аляксандр КАРКАТАДЗЭ.**

Рэстаўрацыю аб'екта зрабілі максімальна рэалістычнай. Аднавілі не толькі магутныя гарматы, але, напрыклад, і драўляныя лаўкі, на якіх адпачывалі салдаты. Пяты форт узвялі ў 1880 годзе. Для свайго часу ён быў непрыступным бастыёнам. Вакол па перыметры ўмацавання пракапаныя раўкі, запоўненыя вадой. Будаўнікі, дарэчы, у асобных месцах узводзілі платы, каб дабірацца да сцен падчас рэстаўрацыі. Брэст-Літоўская адносілася да крэпасцяў першага класа магутнасці. Адпаведна класу таўшчыня сцен і падземных калідораў складае тры метры. Такую «браню» нават сучасная артылерыя прабіць не здольная.

Наверсе, у казармах, салдаты жылі і праходзілі навучанне. У выпадку нападзення ворага ў іх была магчымасць спусціцца ўніз і перачакаць абстрэл. Цяпер тут з'явіліся лаўкі, дакладныя копіі такіх з XIX стагоддзя. Іншыя прадметы інтэр'ера таксама вельмі дакладныя.

Асаблівую прыцягальнасць новай экспазіцыі надаюць падземныя хады. Сюды не трапляе дзённае святло, а столь нагадвае пячору. У суправаджэнні экскурсавода можна паблукаць па гэтых загадкавых лабірынтах. Музей уладкаваны ў так званай гаржавой казарме. У ходзе рэстаўрацыі ачышчаны сцены і фасады, пракладзены інжынерныя сеткі, заменены вокны і дзверы. Экспазіцыя размясцілася ў шасці казематах і складаецца такім чынам з шасці залаў. Першая зала расказвае аб гісторыі фартыфікацыі на беларускіх землях. Тут можна даведацца, напрыклад, пра старажытныя Берасцейскі і Ляхавіцкі замкі, іншыя падобныя збудаванні. Другая — прысвечаная Брэсцкай крэпасці ў фартыфікацыйнай сістэме на заходніх граніцах Расійскай імперыі. Тут змешчана шмат цікавай інфармацыі не толькі пра крэпасць, але і пра гісторыю Брэста, яго перасяленне на новае месца ў сувязі з будаўніцтвам крэпасці. У трэцяй зале расказваецца аб мадэрнізацыі цытадэлі над Бугам у пачатку XX стагоддзя і будаўніцтве двух фартовых паясоў. Таксама адноўлены інтэр'еры жылога каземата для ніжніх чыноў, цэйхгаўза, канцылярыі, умывальні. Частка экспазіцыі размешчана ў капаніры, парахавым склепе. У цэлым з дапамогай карцін, мэблі, іншых экспанатаў аўтарам удалося аднавіць атмасферу часу, у холах форта адчуваеш сябе, нібы апынуўся ў XIX стагоддзі.

ДАСТОЙНЫ ПРАЦЯГ ЛЕТАПІСУ

Аб подзвігу абаронцаў крэпасці, якія стаялі тут насмерць у 1941-м годзе, нагадвае асобная інсталяцыя. У гэтых казармах разгарнуліся жорсткія баі падчас абароны. На ўваходзе наведвальнікаў сустракаюць цені абаронцаў. Іх стварылі пры дапамозе асаблівай тэхналогіі — са святла, шкла і малюнка.

Старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК адзначыў падчас адкрыцця, што горад атрымаў новы ўнікальны музей, які стане пунктам прыцягнення турыстаў. Паводле яго слоў, гарвыканкам бярэ на сябе абавязацельствы па комплексным добраўпарадкаванні тэрыторыі. Неўзабаве да форта будзе працягнуты маршрут грамадскага транспарту, бо цяпер дабрацца сюды даволі праблематычна.

Спецыялісты ж прагназуюць вялікую цікавасць турыстаў да новага аб'екта. **Міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ** адзначыў своечасовасць і актуальнасць укладання сродкаў з саюзнага бюджэту ў рэстаўрацыю аб'ектаў крэпасці: «Пяты форт дастойна працягне летапіс шматгранай і велічнай гісторыі Брэсцкай крэпасці, стане яшчэ адным сімвалам памяці і шанавання подзвігу савецкага салдата, які прайшоў дарогамі вайны і здабыў Вялікую Перамогу».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Добрая навіна

Дзіцячы дом сямейнага тыпу адкрылі ў Брэсце

Дзіцячы дом сямейнага тыпу ў Ленінскім раёне Брэста стаў дзявятай па ліку падобнай установай у абласным цэнтры. Двухпавярховы будынак узвялі па вуліцы Дуброўскай побач з домам, які адкрылі летась.

Навасёламі сталі бацькі-выхавальнікі Марыя і Андрэй Казловы, а таксама шасцёра дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. У Марыі з Андрэем дзве свае дачкі-студэнткі. А зараз сям'я папоўнілася хлопчыкамі і дзяўчынкамі з трох сем'яў ва ўзросце ад 5 да 13 гадоў.

Новы дом прасторны і ўтульны. Акрамя звыклых мэблі і бытавой тэхнікі, тут створана безбар'ернае асяроддзе: павялічаныя дзвярныя праёмы, ёсць электрапад'ёмнік. Устаноўлены поручні.

Павіншаваць з навасяллем жыльцоў прыехалі кіраўнікі гарадской і раённай улады, будаўнікі, спонсары. **Старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Мікалай КРАСОЎСКІ** пажадаў сям'і цяпла ў доме, узаемаразумення, поспехаў: бацькам — у рабоце, дзецям — у вучобе. **Кіраўнік адміністрацыі Ленінскага раёна Брэста Валянцін МІЛАШЭЎСКІ** адзначыў, што будаўніцтва дома абышлося бюджэту ў 422 тысячы рублёў. Паводле яго слоў, дзяржава робіць усё, каб дзеці адчувалі сябе абароненымі, раслі і развіваліся ў камфортных умовах. Гэта 58-ы дзіцячы дом сямейнага тыпу ў Брэсцкай вобласці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Кузня кіраўніцкіх кадраў

Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь за 30 гадоў падрыхтавала больш за 95 тысяч спецыялістаў. Аб гэтым расказаў яе рэктар, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.

— Штогод у нас праходзіць падрыхтоўку і навучанне больш за дзве тысячы кіраўнікоў і спецыялістаў дзяржаўных органаў і арганізацый. 70 працэнтаў дзеючага ўрада краіны — выпускнікі ўстановы, і мы гэтым, безумоўна, ганарымся. Акадэмія кіравання працуе і развіваецца па трох асноўных кірунках. Гэта Інстытут кіраўніцкіх кадраў, на базе якога праходзяць навучанне студэнты, — іх на сёння ў нас 3014. Таксама Інстытут дзяржаўнай службы, дзе ў нас 2403 слухачы. Трэці кірунак дзейнасці — Навукова-даследчы інстытут тэорыі і практыкі дзяржаўнага кіравання. У Акадэміі рыхтуюцца 208 магістрантаў, 121 аспірант і дактарант. Усяго вядзецца падрыхтоўка па 21 спецыяльнасці. На мой погляд, гэта даволі шырокі спіс. І цяпер мы ставім перад сабой задачу не гнацца за колькасцю, а павышаць якасць адукацыі, спалучаючы адукацыйны працэс з выхаваўчым.

Традыцыйна спецыяльнасці, на якіх вучацца студэнты Інстытута кіраўніцкіх кадраў, уваходзяць у топ-10 самых запатрабаваных сярод ВНУ Беларусі. У Акадэміі кіравання працуюць 686 супрацоўнікаў, з іх 291 — гэта прафесарска-выкладчыцкі склад.

— Усе, хто прыходзіць да нас вучыцца ці выкладаць, гэта сапраўдныя патрыёты сваёй Бацькаўшчыны. Мы ўлічваем тое, што патрабаванні да кіраўніцкіх кадраў з часам мяняюцца, бо змяняецца грамадска-палітычная сітуацыя, сацыяльна-эканамічныя адносіны і іншае. Перакананы, што ў сучасных умовах кіраўнікі павінны мець трывалую нацыянальна-дзяржаўную пазіцыю, умець весці за сабой, фарміраваць актуальны парадак грамадскага развіцця. Сёння ў прыярытэце практыкаарыентаваная адукацыя. Мы актыўна супрацоўнічаем з рознымі ўстановамі, арганізацыямі, прадпрыемствамі, на якіх могуць працаваць нашы выпускнікі, або з тымі, хто нам каштоўны ў плане ўзаемадзеяння ў адукацыйным і выхаваўчым працэсе. Лічу важным, каб да нас прыходзілі і дзяліліся сваім вопытам дзяржаўныя чыноўнікі. Гэта важны аспект, асабліва для слухачоў, якія праходзяць перападрыхтоўку і павышаюць кваліфікацыю.

У Акадэміі кіравання створаны ўсе неабходныя ўмовы для забеспячэння бесперапыннай адукацыі кіраўніцкіх кадраў.

— Мы будзем умацоўваць практыкаарыентаваны складнік шляхам фарміравання сістэмы кейсаў і дзелавых гульняў, скіраваных на рашэнне канкрэтных кіраўніцкіх задач. А таксама праводзіць кароткатэрміновыя курсы па павышэнні кваліфікацыі прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і арганізацый, што дазваляе мінімальна адрываць спецыялістаў ад іх прафесійных абавязкаў. За кароткі адрэзак часу можна даць ім неабходныя веды, актуальныя ў сучасным грамадстве. У нас укаранёна сістэма апаратнай відэаканферэнц-сувязі, электроннага дакументазвароту, актыўна фарміруюцца электронныя вучэбна-метадычныя комплексы, якія могуць выкарыстоўвацца ў тым ліку ў дыстанцыйнай форме адукацыі.

Дар'я ШЛАПАКОВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пяць тысяч нацгвардзейцаў застанецца ў Вашынгтоне

